ВЫДАЕЦЦА З КАСТРЫЧНІКА 1991 г.
№ 27 (947) 3 — 9 ліпеня 2010 г.

КУЛЬТУРА

WWW.KIMPRESS.BY
ШТОТЫДНЁВАЯ ГРАМАДСКА-АСВЕТНІЦКАЯ ГАЗЕТА

Дарагія суайчыннікі!

Сардэчна віншую вас з Днём Незалежнасці Рэспублікі Беларусь — галоўным дзяржаўным святам, якое адлюстроўвае адзінства і духоўную стойкасць нацыі.

Глыбока сімвалічна, што яго дату вызначылі вы самі на рэспубліканскім рэферэндуме, звязаўшы яе ў адзінае з днём вызвалення Радзімы ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

Краіна талентаў і патрыётаў — вось што такое Беларусь. У ёй няма і не будзе месца забыццю народнага подзвігу. У год 65-годдзя Вялікай Перамогі мы яшчэ раз аддаём даніну павагі бяспрыкладнаму гераізму людзей, якія выратавалі планету ад фашызму.

За час міру і стварэння мы разам ператварылі параненую беларускую зямлю ў квітнеючыя палі і сады, сучасныя прамысловыя цэнтры і аграгарадкі. Такое пад сілу толькі працалюбіваму, высокаінтэлектуальнаму народу.

Незалежнасць і суверэнітэт краіны, мудрасць і бясцэнны вопыт ветэранаў сёння ў руках маладога пакалення. З такой моладдзю Беларусь чакае дастойная будучыня. Ніякія крызісы не спалохаюць дзяцей і ўнукаў Пераможцаў.

Шчыра жадаю вам, дарагія сябры, моцнага здароўя, міру, дабрабыту, спакою і ўпэўненасці ў заўтрашнім дні.

Са святам! З Днём Рэспублікі!

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь
Аляксандр ЛУКАШЭНКА
3 ліпеня 2010 года



"БЕЛАРУСЬ — ГЭТА МЫ!"

Сёння Незалежная Беларусь святкуе Дзень Рэспублікі пад знакам патрыятызму, стваральнасці і духоўнасці. І як сімвал гэтага трыадзінства паўстаў у сталіцы велічны Храм-Помнік, запаліўся яшчэ адзін непагасны Агонь Памяці...

С. 4 — 5

Фота Юрыя ІВАНОВА

Мінск

Урачысты канцэрт 1 ліпеня ў Палацы Рэспублікі, прысвечаны Дню Незалежнасці, які адбыўся адразу пасля ўрачыстага пасяджэння, стаўся адной з першых кульмінацый святочных мерапрыемстваў.

— Гледачы ўжо з першых хвілін, — растлумачыла сваю канцэпцыю рэжысёр Ніна Осіпава, — павінны былі трапіць у своеасаблівы "музей гісторыі" Беларусі. А гэта значыць — убачыць знаных гістарычных постацей, славутых асоб, пачынаючы з эпохі Полацкага княства. Ну, а надалей — святочны дывертысмент, дзе творчая моладзь выступае побач і нароўні з вядомымі артыстамі, што складаюць гонар нашай краіны. Пры гэтым гістарычная лінія не страчваецца, а працягваецца ў сучаснасці, далучаючы нас да лепшых культурных здабыткаў народа. Вольнае развіццё нашага мастацтва ў суквецці іншых культур свету — гэта таксама адна са шматлікіх граней Незалежнасці.

Канцэрт сапраўды сабраў шыкоўнае прадстаўніцтва лепшых салістаў і творчых калектываў рэспублікі.

Апоўдні 3 ліпеня распачнецца шэсце ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны да помніка Перамогі і ўскладанне кветак.

А сёння ўвечары гледачамі святочнага гала-канцэрта "Беларусь — гэта мы!" змогуць стаць не толькі мінчане і госці сталіцы, якія збяруцца ля стэлы "Мінск — горад-герой", але і ўсе тыя, хто ўключыць тэлевізар. Канцэрт, які падрыхтавала і транслюе ў прамым эфіры АНТ, падзяляецца на некалькі блокаў. Тут вылучаецца збор лепшых песень розных гадоў, прысвечаныя роднай Беларусі. Кульмінацыяй стане традыцыйная акцыя "Спяваем гімн разам!", якая завершыцца святочным салютам.

"КРАІНА ТАЛЕНТАЎ

Аляксандр ЛУКАШЭНКА:

"Лепшы спосаб стаць грамадзянінам багатай і квітнеючай дзяржавы — гэта стварыць яе самому"

"Сёння мы — маладая дзяржава, у якой наперадзе каласальныя перспектывы, і ўсе яны звязаны з моладдзю," — пра гэта заявіў Прэзідэнт нашай краіны Аляксандр Лукашэнка 29 чэрвеня, пад час традыцыйнага Рэспубліканскага балю выпускнікоў вышэйшых навучальных устаноў у Палацы Рэспублікі, у якім сёлета прынялі ўдзел 270 лепшых выхаванцаў беларускіх ВНУ.

У сваім слове, звернутым да выпускнікоў, Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што маладыя людзі, завяршыўшы важны этап свайго жыцця, падышлі да новага рубяжа, за якім з кожным днём на іх будзе ўскладацца ўсё больш адказнасці: за блізкіх, сям'ю, выбар свайго месца ў жыцці і, нарэшце, за нашу краіну. "Цяпер вам неабходна скарыстаць падораны лёсам шанц у поўнай меры: не адступаць перад часовымі цяжкасцямі, дзейнічаць рашуча і мэтанакіравана, быць адзінымі і сплочанымі ў любых сітуацыях", — сказаў Прэзідэнт.

"Беларусь развіваецца, нягледзячы на крызісы і знешнія пагрозы, — заявіў Аляксандр Лукашэнка. — Так што тыя, хто робіць стаўку на эміграцыю або супрацьдзеянне сваёй краіне і свайму народу, рана ці позна апынуцца ў пройгрышы, бо лепшы спосаб стаць грамадзянінам багатай і квітнеючай дзяржавы — гэта стварыць яе самому". І дадаў: "Калі вы жадаеце, каб нашу дзяржаву паважалі ва ўсім свеце, то цалкам прысвяціце сябе прымнажэнню яе дабрабыту і духоўнай велічы. Вы пачынаеце дарослае жыццё ў незвычайны час эканамічнага і тэхналагічнага рыўка, якога яшчэ не ведала найноўшая гісторыя нашай краіны", — падкрэсліў беларускі Лідэр.

Прэзідэнт нагадаў, што ў наш час усё больш маладых людзей займаюць кіруючыя пасады, плённа працуюць у перадавых галінах навукі, інфармацыйных тэхналогіях і інавацыйных праектах, адкрываюць новыя прасторы ў сучаснай культуры, уяўляючы з сябе каталізатар дзелавой і творчай актыўнасці, праяўляючы неабыякавасць і крэатыўнасць мыслення. "Не бойцеся адстойваць свой пункт гледжання і змагацца за рэалізацыю ўласных ідэй, — адзначыў у сувязі з гэтым Аляксандр Лукашэнка, — не разменьвайце свой талент на дробязі і не здраджвайце мары".

Лідэр краіны таксама зазначыў, што сёння з боку дзяржавы робіцца стратэгічны разлік на тое, што "наша палітыка, памножаная на энергію і энтузіязм маладых людзей, узніме краіну на такую гістарычную вышыню, пра якую нашы продкі маглі толькі марыць". І, натуральна, дзяржава заўсёды падставіць сваё плячо тым, хто будзе прымнажаць свой уласны талент і прафесійныя здабыткі на карысць роднай краіны. "Але не забывайце, — нагадаў выпускнікам Кіраўнік дзяржавы, — у любой справе ў першую чаргу неабходна разлічваць на ўласныя сілы, самім ствараць сабе рэпутацыю і зарабляць аўтарытэт".

Прэзідэнт выказаў словы падзякі рэктарам і педагогам вышэйшых навучальных устаноў краіны за тую няпростую і карпатлівую працу па выхаванні моладзі, зазначыўшы, што місія іх не абмяжоўваецца адно толькі перадачай прафесійных ведаў і здольнасцей. "Місія педагога — адна з самых складаных і адказных. Бо менавіта ён фарміруе характар і волю, вучыць маладых валодаць тым пяром, якім яны потым упішуць слаўныя старонкі ў летапіс сваёй краіны", — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

Па традыцыі, у рамках Рэспубліканскага балю дзесяць лепшых выпускнікоў айчынных ВНУ былі ўзнагароджаны лістамі аб аб'яўленні Падзякі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь і каштоўнымі падарункамі, якія яны атрымалі ад Лідэра краіны. Пасля быў зроблены калектыўны здымак на памяць разам з Кіраўніком дзяржавы.

Для ўсіх прысутных на Рэспубліканскім балі прагучаў старадаўні студэнцкі гімн — "Gaudeamus", шчырай і натхнёнай была ўрачыстая клятва выпускнікоў, што сталася своеасаблівай прысягай на вернасць сваёй прафесіі, Радзіме і ідэалам дабра і справядлівасці, якім павінен служыць кожны сумленны грамадзянін. Традыцыйным сімвалам выхаду ў новае, невядомае яшчэ жыццё сталася жывое, стракатае "воблака" матылькоў, што ўзляцелі з рук выпускнікоў да самых высокіх вышынь, — бы іх імкненні і надзеі, якія ўжо сёння, пасля заканчэння навучання, крок за крокам пачнуць ператварацца ў рэальнасць.

Па завяршэнні ж урачыстай цырымоніі адбылося студэнцкае свята і прыём ад імя Кіраўніка дзяржавы ў гонар выпускнікоў беларускіх вышэйшых навучальных устаноў.

Таццяна КОМАНАВА

На здымку: Аляксандр Лукашэнка прыняў удзел у Рэспубліканскім балі выпускнікоў.

Фота Мікалая ПЯТРОВА, БелТА

І ПАТРЫЁТАЎ"

Літаральна перад самім Рэспубліканскім балем выпускнікоў у зале прыёмаў сталічнай Ратушы міністр культуры Рэспублікі Беларусь Павел Латушка сустрэўся з лепшымі выпускнікамі Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў, Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі і Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры і мастацтваў.

Новы погляд, свежыя ідэі, крэатыўнае мысленне

Ва ўрачыстай атмасферы міністр павіншаваў выпускнікоў з заканчэннем навучання і ўваходжаннем у новае, прафесійнае і творчае, жыццё. Галоўным пажаданнем будучым дзеячам айчыннага мастацтва сталі словы аб тым, што акурат у гэты момант для іх надышоў час зрабіць правільны выбар свайго далейшага прафесійнага шляху.

Словы падзякі выказаў міністр культуры і рэктарам ВНУ, а ў іх асобах — усім тым педагогам, што аддавалі свае веды і ўменні нашым выпускнікам. Да моладзі звярнуліся госці сустрэчы: народны артыст Беларусі Міхаіл Казінец, заслужаныя дзеячы мастацтваў Беларусі Аляксандр Яфрэмаў і Уладзімір Зінкевіч.

У сваю чаргу, выпускнікі творчых ВНУ звярнуліся са сваімі пытаннямі да міністра культуры. У прыватнасці, на пытанне аб вызначэнні асноўных вектараў развіцця нашай культуры на бліжэйшы час Павел Латушка распавёў наступнае: "Мы цяпер працуем над вельмі важным дакументам — Дзяржаўнай праграмай "Культура Беларусі". Такі дакумент упершыню распрацоўваецца на ўрадавым узроўні. Урад ужо зацвердзіў сваёй пастановай канцэпцыю гэтай праграмы, і цяпер ідзе праца над канкрэтным яе напаўненнем. Дзякуючы гэтай праграме і яе рэалізацыі мы будзем мець даволі дакладную сістэму развіцця культуры на бліжэйшыя пяць гадоў з адпаведным дафінансаваннем. Ёю прадугледжваецца ўвядзенне новых механізмаў і схем, якія будуць дадаткова стымуляваць развіццё культуры. Я перакананы: калі мы не пяройдзем да прынцыпу праектнай дзейнасці ў сферы культуры, мы будзем стаяць на месцы. А сістэма праектаў створыць унікальную сітуацыю, дзякуючы якой на самых розных узроўнях, пачынаючы ад раённага аддзела культуры і заканчваючы міністэрствам, літаральна кожны чалавек зможа прапанаваць свае творчыя ідэі, афармленыя належным чынам у праект, і атрымаць пад яго адпаведнае фінансаванне".

На пытанне аб бачанні перспектыў і ролі дызайну ў галіне культуры Павел Латушка адказаў, што сёння немэтазгодна "далучаць" яго да выключна тэхнічнай сферы.

Дарэчы, пад час сустрэчы міністр выказаў і крытычную заўвагу. "Бадай, упершыню за ўсю гісторыю Міністэрства культуры, — сказаў ён, — у гэтым годзе мы прадугледзелі рэальныя сродкі на стажыроўку нашых студэнтаў і дзеячаў культуры за мяжой. Але, на жаль, да гэтага часу мне так і не было пададзена ніводнай заяўкі з канкрэтнымі прапановамі".

У завяршэнне ж сустрэчы прысутныя ў Ратушы выпускнікі атрымалі з рук міністра культуры кветкі і каштоўныя падарункі, а таксама — зрабілі здымак на памяць. Ён — перад вамі!

Т.К.

Фота Юрыя ІВАНОВА

Аб'ява*

Стыпендыяльная праграма Міністра культуры і нацыянальнай спадчыны Рэспублікі Польшча "Gaude Polonia"

Нацыянальны цэнтр культуры аб'яўляе конкурс на атрыманне стыпендыі на шасцімесячны курс навучання ў Польшчы ў рамках стыпендыяльнай праграмы Міністра культуры і нацыянальнай спадчыны Рэспублікі Польшча "Gaude Polonia". Праграма "Gaude Polonia" прызначаецца для маладых дзеячаў культуры і перакладчыкаў з краін Цэнтральнай і Усходняй Еўропы.

Курс навучання ў Польшчы распачнецца 1 лютага і будзе доўжыцца да 31 ліпеня 2011 года. Набор удзельнікаў ажыццяўляецца на конкурснай аснове. Кандыдаты павінны валодаць польскай мовай на базавым узроўні. Заяўкі прымаюцца да 15 кастрычніка 2010 года.

*Падрабязную інфармацыю аб праграме і бланкі анкет можна атрымаць на інтэрнэт-старонцы **www.nck.pl/kategoria/234/gaude-polonia/pr/true**, а таксама ў польскіх дыпламатычных прадстаўніцтвах у Мінску і ў Нацыянальным цэнтры культуры ў Варшаве (тэл.: +48 22 210 01).*

Брэстчына

У Брэсце 3 ліпеня а 10-й гадзіне раніцы на плошчы Перамогі, а ў 10.40 — у Брэсцкай крэспасці адбудзецца ўрачыстае ўскладанне кветак і вянкоў з удзелам кіраўніцтва вобласці і горада, ветэранаў і моладзі. Пасля на працягу дня запланаваны святочныя мерапрыемствы ў парках культуры і адпачынку, а ў 21 гадзіну распачнецца канцэрт, прымеркаваны да Дня Незалежнасці Рэспублікі Беларусь.

Напрыканцы дня, а 22-й гадзіне, адбудуцца святочны салют і феерверк, які пройдзе ў Брэсцкай крэпасці. А ў 22.55 у рамках акцыі "Спяваем гімн разам!" фінальным акордам у Брэсце прагучыць Дзяржаўны гімн Рэспублікі Беларусь.

Віцебшчына

У абласным цэнтры Дзень Незалежнасці адзначаны тэатралізаваным шэсцем. Гарадскі цэнтр рамёстваў "Задзвінне" прапануе выстаўкі дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва і канцэртныя праграмы самадзейных творчых калектываў. Вядома, усіх віцябчан і гасцей горада чакае таксама мноства забаўляльных мерапрыемстваў.

Гомельшчына

Урачысты сход і святочны канцэрт, падрыхтаваны эстрадна-сімфанічным аркестрам абласной філармоніі, прайшлі 2 ліпеня ў Гомельскім абласным грамадска-культурным цэнтры. Пад час мерапрыемства сем прадстаўнікоў Гомельшчыны атрымалі званне "Чалавек года". Сярод іх у намінацыі "Майстар" — дырэктар Гомельскай дзіцячай харэаграфічнай школы і рэжысёр масавых мерапрыемстваў Пётр Свярдлоў.

У Гомельскім палацава-паркавым ансамблі пачала працаваць фотадакументальная выстаўка, у абласной універсальнай бібліятэцы — літаратурная экспазіцыя.

Гродзеншчына

Святочныя мерапрыемствы з нагоды Дня Незалежнасці распачнуцца ў абласным цэнтры 3 ліпеня. А 10-й раніцы на плошчы Леніна пройдзе мітынг, а пасля — ускладанне кветак у гарадскім парку.

Па вуліцах горада пройдуць войскі Гродзенскага гарнізона, а пасля ў парку і на плошчы Савецкай распачнуцца канцэрты з удзелам лепшых калектываў горада. Завершацца мерапрыемствы акцыяй "Спяваем гімн разам!".

Магілёўшчына

Святкаванне ў Магілёве стартавала з ускладання кветак у Мемарыяльным комплексе "Буйніцкае поле". Бібліятэкі абласнога цэнтра доўжаць культурна-адукацыйную акцыю "Магілёў — горад тых, хто чытае". Ля ратушы праходзіць выстаўка старадаўніх аўтамабіляў. На Савецкай плошчы ўвечары адбудзецца музычна-забаўляльная праграма "Мой цудоўны і прыгожы Магілёў". А ў скверы 40-годдзя Перамогі для ветэранаў вайны і працы рыхтуецца святочная праграма з удзелам духавога аркестра "В городском саду играет...". А 23-й на ўзбярэжжы Дняпра ўсе ўбачаць святочны феерверк.

Міншчына

У Мінскай вобласці святочныя мерапрыемствы распачаліся ўжо 2 ліпеня. У 12 гадзін на Кургане Славы прайшла цырымонія ўрачыстага ўскладання кветак і вянкоў з удзелам кіраўніцтва Мінскага аблвыканкама. У гэты ж час на тэрыторыі Мемарыяльнага комплексу "Хатынь" таксама адбылося ўскладанне кветак з удзелам дэпутатаў Мінскага абласнога савета.

Храм Гонару, Доблесці

Непадалёк ад духоўнай скарбніцы беларускага народа і, адначасова, аднаго з самых высокіх будынкаў Мінска — Нацыянальнай бібліятэкі краіны — размяшчаецца храм-помнік у гонар Усіх Святых і ў памяць бязвінна забітых у нашай Айчыне. Ён вылучаецца памерамі і арыгінальнасцю архітэктурнага рашэння — шатровай формай, даволі рэдкай у сучаснай праваслаўнай будаўнічай традыцыі. Яшчэ адной, не менш важнай, адметнасцю храма стала крыпта, размешчаная ў яго ніжнім узроўні, — унікальны мемарыяльны комплекс, звязаны з гісторыяй нашага народа. Невыпадкова яе адкрыццё адбылося напярэдадні Дня Незалежнасці, і за ім назірала на пляцоўцы каля царквы і ў тэлетрансляцыі ўся краіна.



Напярэдадні ўрачыстасцей карэспандэнт "К" сустрэўся з настаяцелем храма, старшынёй Каардынацыйнага савета знешніх сувязей Беларускага Экзархату, протаіерэем Фёдарам ПОЎНЫМ, каб даведацца аб падрабязнасцях падзеі і гісторыі храма. Між іншым, айцец Фёдар, які ў свой час скончыў Беларускі дзяржаўны тэатральна-мастацкі інстытут, з'яўляецца аўтарам канцэпцыі крыпты і адным з архітэктараў усяго велічнага збудавання разам з Львом Пагарэлавым.

— Урачыстае асвячэнне закладнога каменю храма, у якім прымаў удзел Патрыярх Маскоўскі і ўсяе Русі Алексій II, адбылося 4 ліпеня 1991-га — пад час яго першага афіцыйнага візіту ў Беларусь. А праз пяць гадоў пры ўдзеле Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Аляксандра Лукашэнкі і Мітрапаліта Мінскага і Слуцкага, Патрыяршага Экзарха ўсяе Беларусі Філарэта была закладзена капсула з памятнай граматай у аснову падмурка храма-помніка.

А ў верасні 2006-га адбылося асвячэнне трох званоў храма. Найвялікшы з іх быў перададзены храму ў якасці падарунка ад Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Аляксандра Лукашэнкі. Два астатнія — дар Патрыярха Алексія II і Мітрапаліта Філарэта.

— Для мемарыяла, дзе будуць пахаваны астанкі беларускіх герояў, было абрана менавіта падземнае памяшканне...

— Традыцыя пахаванняў пад храмамі, у крыпце, сягае сваімі каранямі ў глыбокую даўніну і прасочваецца ўжо з першых часоў хрысціянства. У той час, калі адбываліся ганенні на Царкву, свяшчэнныя набажэнствы праходзілі ў пячорах, там жа адбываліся і пахаванні, у тым ліку — першых пакутнікаў за веру. Паводле нашай задумы, крыпта не павінна сімвалізаваць жалобу, змрочны стан душы. Хутчэй, наадварот: чалавек, увайшоўшы сюды, можа спрычыніцца да мінулага нашага краю і пры гэтым не адчуваць прыгнечанасці.

— Крыпта мусіць стаць сакральным месцам літаральна для ўсяго беларускага народа. За кошт чаго атрымалася гэта ажыццявіць?

— Мы імкнуліся максімальна насыціць сімваламі і артэфактамі ўсю гэтую прастору. Пры распрацоўцы ідэі былі вылучаны тры асноўныя акцэнты. Акрамя пахаванняў воінаў, выбітных дзеячаў беларускага краю, у нішах крыпты, аздобленых оніксам, будуць захоўвацца хрустальныя сасуды з зямлёй, прывезенай з месцаў гістарычных бітваў і значных падзей, звязаных з нашым народам. Усяго прадугледжана запоўніць 504 такія нішы. У цэнтры ж памяшкання размясцілася нязгасная лампада, у якой будзе пастаянна гарэць агонь, прывезены ад Труны Гасподняй. Ад яе кожны зможа запаліць свечку ў памяць і пра свой род. Такім чынам даецца магчымасць чалавечай душы, так бы мовіць, адчуць неба, дакрануцца да вечнасці. Гэта сімвал вечнага агню, што напаўняецца трохі іншым сэнсавым зместам: мы не проста ўшаноўваем памяць продкаў, але і звязваем сваю асабістую памяць з усяленскай, напаўняем нашу памяць малітоўным зместам.

Настаяцель храма — протаіерэй Фёдар Поўны.

Сімвалічна і тое, што кожны год, а 4-й гадзіне раніцы, 22 чэрвеня, у крыпце будзе адбывацца Літургія — малітоўнае памінанне ўсіх, хто загінуў у час Вялікай Айчыннай вайны, як памяць пра пачатак вайны. Гэтак сама, як і 9 мая.

Зрэшты, крыпта — гэта не толькі вобразы і сімвалы, але і гістарычныя старонкі мінуўшчыны: пахаванні рэальных людзей, зямля з палітых крывёю пакутнікаў месцаў… Менавіта гэта і павінна спрыяць, вучыць цаніць сваю гісторыю, правільна арыентавацца ў сённяшнім дні і бачыць правільны шлях у будучыню.

Да таго ж, у нас будзе прадстаўлена не проста зямля, але і інфармацыя пра яе і пра тое, якое дачыненне да яе маюць беларусы. Ужо збіраецца матэрыял для архіва. Іншая справа — для таго, каб ён стаў паўнавартасным, неабходны прафесійны падрыхтоўчы перыяд, бо ўсё ствараецца літаральна з нуля. Тым не менш, мы ўжо маем прозвішчы ўсіх, хто загінуў у канцлагеры пад Мюнхенам у Дахау, шэраг іншых фактаў.

Самае галоўнае — сабраць у гэтым месцы ўсю гістарычную памяць, звязаную з нашай краінай. І гэта не проста прыгожая ідэя. Наша задача — у тым, каб дапамагчы аб'ектыўна адлюстроўваць старонкі айчыннай гісторыі: ці то гэта будуць Асвенцым, Трасцянец, Курапаты, ці то Няміга, Грунвальд. Таму не адмаўляемся і ад дапамогі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, міністэрстваў абароны, культуры, адукацыі нашай краіны: працуем разам і імкнёмся знайсці тыя мадэлі ўзаемадзеяння і супрацоўніцтва, якія прынеслі б у выніку максімальны эфект.

— Цяпер у крыпце будуць пахаваны тры невядомыя ўдзельнікі буйных войнаў апошніх двух стагоддзяў: 1812 года, Першай сусветнай і Вялікай Айчыннай. Ці мяркуецца перапахаваць у гэтым месцы астанкі канкрэтных гістарычных постацей?

— Канкрэтыкі хапае і цяпер. Ідэнтыфікацыю і аналіз астанкаў загінулых воінаў праводзіў Інстытут гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук. Ды і самі знаходкі адлюстроўваюць розныя рэгіёны Беларусі. Так, у раёне Віцебска былі знойдзены рэшткі ўдзельніка вайны 1812 года, пад Гродна — Першай сусветнай, а каля Лоева, на месцы фарсіравання Дняпра, — Вялікай Айчыннай вайны.

Што да гістарычных асоб, то ўжо прапрацоўваецца пытанне па вяртанні з Ялты астанкаў класіка нашай літаратуры Максіма Багдановіча. Чаму б не падумаць і пра князёў Слуцкіх — Алелькавічаў? Таксама, магчыма, у крыпце насупраць месца пахаванняў будуць прадстаўлены часцінкі мошчаў беларускіх святых. Гэткім чынам крыпта дае магчымасць рэальна зразумець і асэнсаваць, адказаць на пытанне, хто мы ёсць… Адначасова і архітэктурнае напаўненне міжволі прыводзіць нас да 2000-гадовай гісторыі Царквы, а таксама мінуўшчыны нашай зямлі.

— Але, каб гэта зразумець кожнаму, відаць, не дастаткова проста завітаць у крыпту — неабходны індывідуальны падыход да чалавека рознага ўзросту, падрыхтоўкі. Ці стане мемарыял своеасаблівым цэнтрам асветы?

— Бясспрэчна: у бліжэйшай перспектыве разглядаецца магчымасць працы з турыстычнымі групамі. Нашы экскурсаводы як у крыпце, так і ў выставачнай зале, музейнай экспазіцыі мусяць даступна данесці да кожнага цэласную і аб'ектыўную інфармацыю, растлумачыць тыя або іншыя гістарычныя факты, у выніку чаго наша грамадства, і найперш — моладзь, павінна яшчэ раз пераканацца ў тым, што мы маем багатую гісторыю. Такім чынам адбываецца фарміраванне духоўнага стрыжня нацыі, нацыянальнай ідэі, гістарычнай памяці.

Я не маю права вырашаць за ваенных, але, на маю думку, за гонар павінна лічыцца прыняцце прысягі ў такім месцы або атрымання тут афіцэрскіх пагонаў. Тады воін, які становіцца на абарону сваёй Айчыны, разумее, дзеля чаго ён служыць сёння, а таксама бачыць і асэнсоўвае, што знаходзіцца за яго плячыма і да чаго гэта абавязвае.

Задумак — вельмі шмат, і якія з іх рэалізуюцца, вядома, пакажа час. Але відавочна, што крыпта можа стаць месцам Гонару, Доблесці і Славы.

— Трапляючы ў крыпту, нельга не адзначыць яе адметную стылістыку. Што дазволіла з падземнага памяшкання зрабіць такі ўрачысты мемарыяльны комплекс?

Ганаровая варта і бронетэхніка

30 чэрвеня "К" звязалася па тэлефоне з камендантам Мінскай ваеннай камендатуры палкоўнікам Анатолем Грыцавым. Ён паведаміў, што менавіта ў гэты час пад Віцебскам, у раёне Гродна і ў Лоеве адбываецца цырымонія ўрачыстай перавозкі ў сталіцу астанкаў невядомых воінаў, што загінулі пад час напалеонаўскай, Першай сусветнай і Вялікай Айчыннай войнаў.

Па словах Анатоля Грыцава, рота ганаровай варты Мінскай ваеннай камендатуры Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь была разбіта дзеля гэтага на тры падраздзяленні. Палкоўнік Грыцаў асабіста прысутнічаў на цырымоніі ў Лоеве. Для перавозкі саркафагаў выкарыстана бронетэхніка. Удзел у мерапрыемствах, што адбыліся ў трох абласцях Беларусі адначасова, бралі, натуральна, падраздзяленні і парадныя разлікі мясцовых вайсковых гасцей.

Не менш маштабным стаў удзел вайскоўцаў і ў цырымоніі пахавання астанкаў вечарам 2 ліпеня ў сталічным храме Усіх Святых. Ва ўрачыстасцях было задзейнічана прыкладна 1300 вайскоўцаў, у тым ліку, безумоўна, і рота ганаровай варты Мінскай ваеннай камендатуры.

і Славы Беларусі

— Праектаванне крыпты было зроблена за два гады, і ўсяго сем месяцаў у нас было на рэалізацыю ідэі. Усё было прадумана да дробязей. Так, толькі для падбору каменю давялося двойчы наведаць Верону. Нельга не адзначыць і беларускіх майстроў, якія дапамагалі нам у стварэнні адметнага інтэр'ера.

У крыпце выкарыстоўваецца сем колераў: сем — свяшчэнная лічба. Намі быў падабраны мармур, граніт, кварцыт. У колеравай гаме мы паспрабавалі зрабіць так, каб наша беларуская тэма таксама прысутнічала, у тым ліку праз элементы стылізаванага арнаменту. Што і казаць, нават падлога падкрэслівае веліч інтэр'ера і, у той жа час, абсалютна не перашкаджае агульнаму ўспрыняццю прасторы. У кампазіцыйным спалучэнні люстры павінны быць урачыстымі і нагадваць лампады, а рознакаляровая падсветка цэнтральнай лампады, у сваю чаргу, — ствараць пачуццё іррэальнасці каменю.

— Але не толькі крыпта мае адметнае мастацкае вырашэнне. Наколькі мне вядома, сам храм-помнік у гонар Усіх Святых будзе мець незвычайныя роспісы...

— Сапраўды, сёння рэдка хто звяртаецца да традыцыі размяшчэння выяў святых на знешняй сцяне царквы. Большасць сучасных храмаў усе свае роспісы маюць унутры збудавання. Але, акрамя вонкавых роспісаў, яшчэ адной адметнасцю храма-помніка стануць і шыльдачкі на яго сценах з імёнамі тых, хто загінуў пад час ваенных дзеянняў.

Занатаваў Кастусь АНТАНОВІЧ
Фота Юрыя ІВАНОВА



"Справа важная і карысная"

Як вядома, у крыпце сталічнага храма Усіх Святых будуць пахаваны астанкі воінаў, якія загінулі ў 1812-м, а таксама ў гады Першай сусветнай і Вялікай Айчыннай войнаў. Антрапалагічную і археалагічную экспертызу праводзілі ў Інстытуце гісторыі НАН Беларусі.

— Тое, што ствараецца такое месца, дзе будуць пахаваны астанкі ўдзельнікаў войнаў 1812 года, Першай суветнай і Вялікай Айчыннай, — гэта вельмі важна, — мяркуе намеснік дырэктара Інстытута гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі Вячаслаў Даніловіч. — Бо гэта — памяць пра тыя войны, што прайшлі па тэрыторыі нашай краіны. Заслуга нашых супрацоўнікаў у гэтай справе — немалая, паколькі без навуковай экспертызы немагчыма дакладна ідэнтыфікаваць, калі было зроблена пахаванне.

Супрацоўнікі аддзела ваеннай гісторыі і старшы навуковы супрацоўнік Інстытута, кандыдат гістарычных навук Шаміль Бекцінееў кансультавалі беларускіх вайскоўцаў з пошукавай брыгады наконт таго, дзе могуць знаходзіцца месцы пахавання воінаў. А антрапалагічную экспертызу астанкаў зрабілі ў аддзеле антрапалогіі і экалогіі Інстытута гісторыі. Як распавёў "К" малодшы навуковы супрацоўнік апошняга Мікалай Памазанаў, усяго даследаваліся астанкі з чатырох месцаў раскопак у розных абласцях Беларусі. Праводзіла экспертызу доктар біялагічных навук, вядучы навуковы супрацоўнік аддзела антрапалогіі і экалогіі Інеса Салівон. Дзякуючы даследаванню ўдалося ўстанавіць, што пахаванні ўдзельнікаў вайны 1812 года знаходзяцца ў вёсках Астроўна і Бузуны Бешанковіцкага раёна Віцебскай вобласці, Першай сусветнай — у вёсцы Рацічы, што на Гродзеншчыне, а ўдзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны — у вёсцы Удалеўка Лоеўскага раёна Гомельскай вобласці.

Гледачы, якія бачылі цырымонію перапахавання астанкаў трох салдат трох войн у крыпце храма Усіх Святых на ўласныя вочы або з тэлеэкранаў, былі ўражаны не толькі маштабамі дзеі, але і яе прачулым гуманістычным пафасам. Пабываўшы на адной з рэпетыцый цырымоніі, можна было здзівіцца таму, з якой далікатнай дбайнасцю прапрацоўвалася кожная яе дэталь.

Убачыць грандыёзную задуму ў поўным выглядзе ў рэпетыцыйных умовах, вядома, было няпроста. Але галоўны рэжысёр урачыстасці — заслужаны дзеяч мастацтваў Рэспублікі Беларусь Мікалай ДУДЧАНКА распавёў карэспандэнту "К" пра той глыбінны сэнс, які ён укладвае ў гэтую дзею. Бліц-інтэрв'ю адбывалася непасрэдна на прыступках храма, пад пералівы званоў, якія ці не ўпершыню напоўнілі ваколіцы.

— Самае галоўнае пры адлюстраванні святых тэм — пазбегнуць фармалізму, — лічыць рэжысёр. — Бо інакш не будзе водгуку ў сэрцах людзей, не ўдасца перадаць разнастайныя эмоцыі, што з'яўляюцца стрыжнем гэтай дзеі, тэма якой — стан чалавечай душы. Таму тут для мяне важным было ўсё: музыка, насычанасць сімваламі, нават святло. Акампаніруючы музычнай структуры, апошняе з'яўляецца выдатным спосабам перадачы настрою. Таму гэты інструмент быў задзейнічаны напоўніцу: ад агню свечкі і да вялізных зенітных пражэктараў, якія ў пэўны кульмінацыйны момант нечакана асвятляюць купалы храма.



Сёння і заўжды

Што да сімволікі... Перш-наперш, вельмі сімвалічным мне падаецца тое, што цырымонія, аналагаў якой у нашай гісторыі я не ведаю, адбылася напярэдадні Дня Незалежнасці Рэспублікі Беларусь. Гэта сведчыць пра духоўныя арыенціры нашай дзяржавы, пра тое, што сваю будучыню мы будуем на ўшанаванні продкаў. Цырымонія — пачатак новай традыцыі: выказваць пашану героям Беларусі розных часоў, маліцца за іх душы ў гэтым храме.

Выступаць рэжысёрам такой знакавай урачыстасці — вялікая адказнасць. Перапахаванне астанкаў тых, хто аддаў сваё жыццё дзеля выратавання Айчыны, — гэта не толькі наш абавязак, але і выхаванне патрыятызму. На такім высокім узроўні падобная дзея праводзіцца ў нас упершыню, і мы, можна сказаць, закладаем новую традыцыю — перапахаванне на Радзіме астанкаў вялікіх беларусаў. Ужо праз нейкі час, як вядома, плануецца перанесці сюды прах Максіма Багдановіча...

Хацелася паказаць пераемнасць эпох і пакаленняў, таму ў ганаровай варце ля крыпты паўстаюць і "сведкі" гістарычных падзей — салдаты ў строях 1812-га, 1914-га і 1945-га гадоў, і нашы сучаснікі — цяперашнія вайскоўцы і суворацы. Дзяўчаты ў белых адзеннях, стоячы па краях лесвіцы, трымаюць тры тысячы свечак. І гэтыя свечкі разам са званамі сімвалізуюць саму дарогу да храма. Вельмі хочацца, каб кожны ўдзельнік і відавочца цырымоніі адчуў сябе далучаным да гісторыі ва ўсіх сэнсах гэтага слова: і да нашай мінуўшчыны, і да той гісторыі, што ствараецца намі сёння.

— Музыка, — сказаў галоўны дырыжор Дзяржаўнага акадэмічнага сімфанічнага аркестра Беларусі Аляксандр Анісімаў, — заўсёды мела і будзе мець вялізнае эмацыйнае ўздзеянне на чалавека.

Званы як сімвал ачышчэння

Да нашага аркестра далучыліся і іншыя творчыя калектывы: Дзяржаўная акадэмічная харавая капэла імя Рыгора Шырмы, з якой мы цесна супрацоўнічаем, аркестр і хор Нацыянальнай тэлерадыёкампаніі, Узорна-паказальны аркестр Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь. Канцэрты падобных з'яднаных складаў на адкрытым паветры ладзяцца ў нас не ўпершыню. Але дадзенае выступленне — папраўдзе асаблівае. І перад намі былі пастаўлены разнастайныя задачы: стварэнне гэткай музычнай інтрадукцыі да ўрачыстай дзеі, потым — непасрэдны ўдзел у цырымоніі і на заканчэнне, нарэшце, асобная канцэртная праграма.

Спыніліся мы, вядома, на рускай і заходнееўрапейскай класіцы, уключыўшы ў праграму самыя разнастайныя творы, што адпавядаюць сітуацыі і паводле свайго зместу, і, зразумела, паводле настрою. Безумоўна, немагчыма было абмінуць Урачыстую ўверцюру Чайкоўскага "1812 год". У канцэртную ж праграму ўвайшоў "Урачысты марш" Чайкоўскага, "Волатаўскія вароты" Мусаргскага, фрагменты з кантаты "Аляксандр Неўскі" і оперы "Вайна і мір" Пракоф'ева. Усё гэта — лепшыя старонкі музычнай патрыётыкі і ўрачыстасці, што абуджаюць у слухачоў гонар за гераічнае мінулае. А тое, што ў некаторых творах да гучання аркестравых званоў далучаліся званы новага храма, сталася цудоўным сімвалам узнёслай духоўнасці і духоўнага ж ачышчэння.

У аб'ектыве АТН

Намеснік генеральнага дырэктара Агенцтва тэлевізійных навін Нацыянальнай дзяржаўнай тэлерадыёкампаніі Рэспублікі Беларусь Юрый Гроераў паведамляе "К", што цырымонія ў сталічным храме Усіх Святых не мае аналагаў. Таму і задача перад АТН стаяла больш чым канкрэтная: дакладна данесці да тэлегледача веліч неардынарнай падзеі, яе маштабы і сацыяльную значнасць.

Дзеля гэтага, як кажа Юрый Гроераў, была задзейнічана немалая група рэжысёраў, аператараў, каб трансліраваць відовішча ў прамым эфіры Першага канала з васемнаццаці розных пунктаў. Адна з тэлекамер, да прыкладу, была ўладкавана на даху бліжэйшага дваццаціпавярховіка.

Для тых, хто назіраў дзею непасрэдна на пляцоўцы перад храмам, дадаткова былі ўстаноўлены два вялікія экраны. Карацей, для тэлезабеспячэння падзеі выкарыстоўвалася найлепшая тэхніка Белтэлерадыёкампаніі.

Стратэгія лучнасці з Бацькаўшчынай

Сустрэча ў Мінску як каардынаты для беларусаў замежжа

Адной з самых доўгачаканых падзей для беларускай супольнасці замежжа стала стварэнне Кансультатыўнага савета, першае пасяджэнне якога адбылося 25 чэрвеня ў сценах Нацыянальнай бібліятэкі краіны. Доўгі час для нашых суайчыннікаў, што воляй лёсу былі раскіданы па многіх краінах свету, ці не адзінай магчымасцю сабрацца разам і абмеркаваць існуючыя праблемы, намеціць шляхі іх супольнага вырашэння з'яўляліся З'езды беларусаў свету, якія з 1993 года прайшлі пяць разоў.

Не выпадкова — з мэтай паляпшэння каардынацыі сувязей і аказання дапамогі з боку дзяржаўных органаў Рэспублікі Беларусь грамадскім арганізацыям беларусаў замежжа — на леташнім форуме з'явілася задума стварыць Кансультатыўны савет па справах беларусаў замежжа пры Міністэрстве культуры краіны. Старшынёй Савета стаў міністр культуры Павел Латушка, які адкрыў першае яго пасяджэнне. У працы прадстаўнічага форуму прынялі ўдзел Упаўнаважаны па справах рэлігій і нацыянальнасцей Леанід Гуляка — ён з'яўляецца намеснікам старшыні Савета, — прадстаўнікі міністэрстваў адукацыі, інфармацыі і замежных спраў Беларусі, іншых дзяржаўных устаноў і грамадскіх арганізацый.

Пра тое, што стварэнне Кансультатыўнага савета па справах беларусаў замежжа наспела даўно, можна было пераканацца па надзвычай жывым, а часам і гарачым, абмеркаванні Палажэння аб гэтай структуры. Яно адбывалася яшчэ перад пачаткам пасяджэння паміж яго ўдзельнікамі: кіраўнікамі беларускіх аб'яднанняў Латвіі, Літвы, Малдовы, Польшчы, Расіі, Украіны і Эстоніі — актыўнымі дзеячамі 20 грамадскіх арганізацый замежжа.

Пра што ж гаварылі ў Авальнай зале Нацыянальнай бібліятэкі і якія надзённыя пытанні ўзніміліся нашымі суайчыннікамі з-за мяжы?

Захаванне, умацаванне, развіццё

У сваім выступленні міністр культуры Рэспублікі Беларусь Павел Латушка адзначыў, што Міністэрства гатова да супрацоўніцтва як з грамадскімі арганізацыямі нашых землякоў у іншых краінах, так і з канкрэтнымі асобамі ў справах папулярызацыі айчыннай культуры, яе шырокага прадстаўлення за мяжой. "Мы разглядаем дзеячаў беларускага замежжа як партнёраў па прэзентацыі нашай культуры ў краінах пражывання. І будзем удзячныя за падтрымку, садзейнічанне і нават інфармаванне пра міжнародныя і нацыянальныя культурныя мерапрыемствы", — падкрэсліў міністр.

Павел Латушка працытаваў на пасяджэнні выказванне Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі: "Лічу, што павінны з'яднацца ўсе беларусы: не толькі тыя, хто жыве на Радзіме, але і тыя, хто з розных прычын апынуўся за мяжой. Беларуская дыяспара павінна адчуваць сваю датычнасць да падзей, што адбываюцца ў краіне, але і мы мусім праявіць свой клопат аб суайчынніках, якія апынуліся за мяжой…"

Міністр падзякаваў беларусам замежжа за тыя намаганні, што робяцца ў справе зберажэння за межамі Бацькаўшчыны сувязей са сваімі каранямі, захоўвання глыбінных традыцый беларускай культуры, і, у той жа час, акрэсліў сваё бачанне новай структуры. "Важна, што мы разумеем і маем перад сабой агульныя і надзвычай адказныя мэты: захаванне, умацаванне і далейшае развіццё беларускай нацыі, культуры і мовы. Гэтыя мэты і задачы павінны стаць асноўнымі для Кансультатыўнага савета", — падкрэсліў Павел Латушка.

Міністр выказаў спадзяванне, што Савет не будзе абмежаваны як па колькасці, так і па геаграфіі ўдзельнікаў, а абмеркаванае і прынятае Палажэнне аб Кансультатыўным савеце стане тым нарматыўным дакументам, які акрэсліць далейшыя шляхі ўзаемадзеяння.

Сярод задач Савета, у прыватнасці, вылучаюцца аказанне суайчыннікам практычнай дапамогі ў захаванні і развіцці нацыянальна-культурнай самабытнасці, заахвочванне беларусаў замежжа да ўдзелу ў рэалізацыі сацыяльна-эканамічных, грамадска-культурных і іншых праграм, што праводзяцца Рэспублікай Беларусь, да супрацоўніцтва ў сферы турызму, арганізацыя культурнага абмену, падтрымка інфармацыйных сувязей. У прыватнасці, запланавана забеспячэнне на базе беларускіх аб'яднанняў у іншых краінах правядзенне выставак-прэзентацый і мерапрыемстваў па папулярызацыі турыстычных магчымасцей нашай дзяржавы.

На думку Паўла Латушкі, міждзяржаўныя кантакты даюць дадатковыя магчымасці ў арганізацыі разнастайных культурных праектаў беларускім арганізацыям замежжа; у тым ліку імі могуць актыўна выкарыстоўвацца тыя напрацоўкі ў міжкультурным супрацоўніцтве, якія дасягнуты Міністэрствам культуры ўжо з 30 краінамі свету. Дзякуючы гэтаму, толькі за апошнія два гады Дні культуры праводзіліся дзевяць разоў у васьмі краінах.

Форум прадэманструе патэнцыял

Не менш важнай часткай пасяджэння стала і прэзентацыя дасягненняў беларусаў замежжа на Бацькаўшчыне. Як адзначыў старшыня Беларускага грамадска-культурнага таварыства ў Польшчы Ян Сычэўскі, для іх музычных калектываў і асобных творцаў надзвычай неабходным з'яўляецца паказ сваіх дасягненняў перад публікай і найперш — кантакт з этнічнай Радзімай. А таму Першы Фестываль мастацтваў беларусаў свету, які, па ініцыятыве Міністэрства культуры і апарата Упаўнаважанага па справах рэлігій і нацыянальнасцей, плануецца правесці ў Беларусі ў 2011 годзе, можа стаць выдатнай магчымасцю сабраць і прадэманстраваць творчы патэнцыял нашых суайчыннікаў, што пражываюць за мяжой.

Па словах намесніка міністра культуры Тадэуша Стружэцкага, плануецца, што канцэрты будуць праходзіць на пляцоўках розных гарадоў Беларусі, а заключныя выступленні — на зорных сцэнах Мінска, у тым ліку Беларускай дзяржаўнай філармоніі і Палаца Рэспублікі. Але калі пытанне з часам правядзення ўжо практычна вырашана (хутчэй за ўсё, мерапрыемствы адбудуцца ў 2011-м напрыканцы чэрвеня — напярэдадні Дня Незалежнасці), дык схема вылучэння ўдзельнікаў Фестывалю выклікала вострую дыскусію сярод кіраўнікоў беларускіх аб'яднанняў. У выніку было прынята рашэнне прымаць заяўкі ад усіх арганізацый, якія пасля дэталёва прааналізуюць, і выберуць найлепшых выканаўцаў. Дарэчы, маштабны творчы форум не абмяжуецца толькі выступленнем песенных і танцавальных калектываў. У прыватнасці, існуюць ідэі правядзення жывапісных і фотавыставак у Нацыянальных мастацкім і гістарычным музеях. Цягам трох — пяці фестывальных дзён таксама адбудуцца і літаратурныя вечарыны, майстар-класы для студэнтаў у вышэйшых навучальных установах. Чакаецца, што на першы форум, які прапанавана праводзіць раз у два гады, прыедзе не менш за 300 удзельнікаў з розных краін свету.

Закон і яго плён

Паспрыяць узняццю беларускага духу ў прадстаўнікоў беларускай дыяспары можа Закон Рэспублікі Беларусь "Аб суайчынніках, што пражываюць за мяжой". Аб падрыхтоўцы яго праекта распавёў Упаўнаважаны па справах рэлігій і нацыянальнасцей Леанід Гуляка.

Старшыня Галоўнага праўлення Беларускага грамадска-культурнага таварыства ў Польшчы Ян Сычэўскі ў сувязі з гэтым адзначыў, што ўлады Рэспублікі Беларусь заўсёды праяўлялі высокую зацікаўленасць да суайчыннікаў замежжа: "Гэтая ініцыятыва з'яўляецца пацвярджэннем далейшага цеснага супрацоўніцтва паміж Радзімай і дыяспарай. Пры гэтым створаны Савет дазволіць даведацца пра працу і праблемы суполак, арганізацый беларусаў замежжа, іх патрэбы, неабходныя для жыццядзеяння культуры, захавання народнай спадчыны. Спадзяюся, мы будзем рухацца ў правільным і плённым для ўсіх напрамку".

Ці не ў кожнага прадстаўніка дыяспары ёсць разнастайныя пытанні, клопаты, звязаныя, найперш, з захаваннем сваёй нацыянальнай ідэнтычнасці ў свеце. Іх, на думку старшыні Федэральнай нацыянальна-культурнай аўтаноміі "Беларусы Расіі" Валерыя Казакова, таксама дапаможа вырашыць названы заканадаўчы акт. У якасці прыкладу ён прывёў такі факт: калі яшчэ колькі гадоў таму ў Расіі афіцыйна прызнавалі сябе беларусамі 1 мільён 200 тысяч чалавек, то цяпер такіх засталося толькі 816 тысяч. "Відавочна, гэты працэс асіміляцыі агульнымі намаганнямі мы павінны ўнармаваць", — падкрэсліў Валерый Казакоў. Адным з эфектыўных сродкаў для дасягнення падобнай мэты ён вылучыў стварэнне беларускіх школ, факультатываў па вывучэнні нашай роднай мовы і культуры ў розных рэгіёнах Расіі. У прыватнасці, ужо ёсць дамоўленасць з губернатарам Мінскай вобласці Барысам Батурам і кіраўніком Паўднёва-Заходняй акругі Масквы аб адкрыцці ў сталіцы Расіі першай беларускай школы. Да таго ж, на апошнім З'ездзе арганізацыі была пастаўлена задача стварыць у Маскве Незалежны беларускі інстытут — навукова-метадычную ўстанову, якая з цягам часу можа стаць і навучальнай.

Перакананы, што створаны Савет прынясе рэальны плён, і старшыня Згуртавання беларускіх грамадскіх арганізацый у Літве Раман Вайніцкі. Па яго словах, надзвычай актуальнай сёння з'яўляецца праблема квот для паступлення ў ВНУ сістэмы Міністэрства культуры. "Мы ў Вільнюсе хочам адрадзіць беларускі музей. Для гэтага нам патрэбны шэраг спецыялістаў, якія выдатна ведаюць бібліятэчную і музейную справы. Увогуле, вельмі хацелася б, каб Кансультатыўны савет быў месцам, дзе мы маглі б адкрыта выказваць і абмяркоўваць свае праблемы", — распавёў прадстаўнік беларускай дыяспары Літвы. Дарэчы, запатрабаваны не толькі згаданыя спецыялісты, але і выкладчыкі па ігры на нацыянальных інструментах. Міністэрствам культуры Рэспублікі Беларусь запланавана, у прыватнасці, наладзіць сістэмныя майстар-класы для суайчыннікаў.

Але калі сітуацыя з паступленнем у нашы ВНУ ў суайчыннікаў з Літвы, Латвіі і Польшчы (яны штогадова маюць вызначаную квоту месцаў на бюджэтную форму навучання: 20, 10 і 40 адпаведна) вырашаецца станоўча, дык беларусы Малдовы працяглы час не маюць магчымасці навучацца на гістарычнай радзіме. Гэта адзначыла старшыня Таварыства беларускай культуры горада Бендэры Ганна Лапацьева. У той жа час, па яе словах, малдаўская дыяспара адчувае падтрымку з боку Радзімы, актыўна супрацоўнічае не толькі ў культурнай, але і ў эканамічнай сферах, дзякуючы чаму вырашае злабадзённае пытанне з фінансаваннем і рэалізуе разнастайныя праекты, у тым ліку сацыяльныя, у прыватнасці, дапамагае суайчыннікам сталага ўзросту ў лячэнні.

Цікавы праект падрыхтаваны і ў Саюзе грамадскіх аб'яднанняў беларусаў Латвіі. Як паведаміла ў размове з карэспандэнтам "К" яго старшыня Валянціна Піскунова, у кастрычніку гэтага года плануецца выдаць беларуска-латышскі слоўнік і зладзіць яго прэзентацыю. Пры гэтым, ужо заключана пагадненне з Інстытутам мовы і літаратуры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі.

***

Першае пасяджэнне Кансультатыўнага савета па справах беларусаў замежжа засведчыла, па-першае, пільную неабходнасць у такой структуры для нашых землякоў у іншых краінах. А па-другое, паказала клопат на высокім дзяржаўным узроўні пра суайчыннікаў, што ўсе мы — беларусы.

Рэалізацыі ініцыятыў Кансультатыўнага савета паспрыяе шэраг праектаў Міністэрства культуры. У прыватнасці, у бліжэйшы час плануецца стварэнне пяці культурных цэнтраў за мяжой, якія стануць тымі месцамі, дзе нашы суайчыннікі змогуць знайсці падтрымку і дапамогу.

Наступным разам сустрэча беларускай дыяспары з грамадскімі і дзяржаўнымі ўстановамі ў такім жа прадстаўнічым фармаце мусіць адбыцца праз год — хутчэй за ўсё, якраз у межах Фестывалю. За гэты час запланавана вырашыць найбольш актуальныя праблемы, адзначаныя ўдзельнікамі першага пасяджэння Кансультатыўнага савета. А сёлета ўдзельнікаў форуму чакала шырокая культурная праграма: экскурсія па Нацыянальнай бібліятэцы, наведванне Нацыянальнага мастацкага музея і Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы. Таксама беларусы замежжа змаглі пабачыць адну з перлін нашай архітэктуры — велічны Мірскі замак — ды паўдзельнічаць у святочных мерапрыемствах у Навагрудку, прысвечаных 600-годдзю Грунвальдскай бітвы. І ўражанні, якія нашы суайчыннікі забралі з сабой і якімі падзеляцца з прадстаўнікамі сваіх нацыянальных суполак, стануць найлепшым прызнаннем у любові да Радзімы і піарам нашай сістэмы працы з землякамі ў свеце. А яшчэ — зарукай поспеху распачатай 25 чэрвеня ў Мінску справы. Справы яднання і адзінства беларусаў.

Кастусь АНТАНОВІЧ
Фота Юрыя ІВАНОВА

Дынаміка “Не пакідай...”

Днямі ў Магілёўскім абласным тэатры драмы і камедыі імя В.І. Дуніна-Марцінкевіча ў Бабруйску адбылася прэм’ера спектакля “Не пакідай мяне” па п’есе Аляксея Дударава ў пастаноўцы Сяргея Карбоўскага. “Жанчына на вайне — сорам для мужчыны”, — гэтая фраза галоўнага героя стала лейтматывам п’есы. Сказаць пра гэта лепш, чым Барыс Васільеў і Станіслаў Растоцкі, наўрад ці можна. Але сама тэма такая, што кожны мае права выказацца, выявіць сваю жыццёвую пазіцыю.

Рэжысёр Карбоўскі вырашае спектакль у жанры драматычнай музычнай балады — у ім шмат музыкі, танцаў: выкарыстаны творы ваенных гадоў, рамансы, аўтарам музыкі да дзвюх песень выступіў сам рэжысёр. Усё гэта і шмат чаго іншага сведчыла пра імкненне стварыць жывое дынамічнае дзейства. Мастак-пастаноўшчык спектакля Валерый Навакоўскі ў якасці галоўнай сцэнаграфічнай дамінанты прапанаваў канструкцыю з трох пашкоджаных ад абстрэлаў арак і разбітай балюстрады ў глыбіні сцэны, якія сімвалізавалі сабой фрагмент панскай сядзібы. Асноўная частка спектакля будавалася як чаргаванне невялікіх па працягласці сцэн у штабе, што разгортваліся на пярэднім плане, і дзеяння ў сядзібе, якое займала галоўнае месца ў спектаклі.

Ролю Капітана Міхасёва выканаў Павел Мікулік, які стварыў вобраз знешне стрыманы, але з актыўным унутраным жыццём. У другім саставе яго сыграў Мікіта Сафронаў, што фактурна вельмі добра падыходзіць для вобраза разведчыка, які прыводзіць языкоў з-за лініі фронту. Вераніка Крэміс Алены Сафронавай — стрыманая, “зацягнутая ў мундзір”, што адпавядала заяўленаму вобразу. Зіна Бацян, роля якой выведзена найбольш жывой і актыўнай, у выкананні Наталлі Буднік атрымалася жартаўлівай, задзірыстай, нават з некаторым выклікам. Яе супрацьлегласць — Ядвіга Гурская (Віталіна Лебедзева) — сціплая, стрыманая, сарамлівая і крыху “ў ценю” Зіны. Аднак у характары гераіні моцна адчуваецца выхаванне і ўменне ў патрэбны момант мабілізаваць уласныя сілы. Асю Ладысеву сыграла Марыя Малішэўская. Яе гераіня, самая юная і рамантычная, адзіная з дзяўчат застаецца ў жывых. У другім прэм’ерным спектаклі гэтую ролю выканала Юлія Пулатава, якая дадала ёй яшчэ больш непасрэднасці, кранальнасці, наіўнасці. Апошні з дзейных асоб спектакля — Палкоўнік, чыю ролю выканаў Анатоль Дваранні каў, хоць і пазначае пэўную зачарсцвеласць уласнага вобраза, аднак рэжысёр не дае яму развіцца.

Сяргей Карбоўскі прызнаваўся, што стужку Станіслава Растоцкага лічыць адной з вяршынь фільмаў пра вайну, і пры пастаноўцы спектакля рэжысёр абапіраўся на свае ўражанні ад яго. Капітан Міхасёў не змог зберагчы даверaных яму дзяўчат, і яму, таксама як і старшыні Васкову ў фільме, мучыцца да канца дзён.

Генадзь БЛАГУЦІН
Бабруйск
На здымках: сцэны са спектакля.

Сальеры на... Месяцы

Высокая арбіта брэсцкіх лялечнікаў

Брэсцкія лялечнікі вядомыя далёка за межамі нашай краіны. Тэатр — уладальнік ганаровага звання “Заслужаны калектыў Рэспублікі Беларусь”, лаўрэат спецыяльнай прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. На яго творчым рахунку — шматлікія гучныя перамогі на самых прэстыжных фестывалях. Летась ён быў адзіным прадстаўніком беларускіх тэатраў лялек на Расійскім фестывалі “Залатая Маска” ў праграме “Маска-Плюс”, дзе спектакль “Месяц Сальеры” паводле А.Пушкіна атрымаў самую высокую ацэнку тэатральнай грамадскасці. Днямі Брэсцкі тэатр лялек завяршыў сваё “турнэ” ажно па чатырох міжнародных фестывалях: у Сербіі, Польшчы, Беларусі і Чэхіі. Дарэчы, брэстчане прывезлі шэраг узнагарод, сярод якіх — Гран-пры Сусветнага фестывалю тэатраў лялек у Празе!

Пачалося ўсё ў сербскай Субоціцы, дзе праходзіў XVII Міжнародны фестываль тэатраў лялек для дзяцей. Брэстчан тут памяталі па спектаклі “Халстамер”, які ў 2006 годзе літаральна зачараваў і гледачоў, і журы фестывалю. Сёлета ж калектыў прадставіў “Месяц Сальеры”, які выклікаў не меншы рэзананс. Спектакль атрымаў два ганаровыя прызы фестывалю: “За лепшую рэжысуру” і “За лепшую мужчынскую ролю”. А яшчэ да падвядзення вынікаў журы, амаль адразу пасля паказу, са сваёй прапановай да тэатра звярнулася Ан-Франсуаз Кабаніс — дырэктар найбуйнейшага Сусветнага фестывалю тэатраў марыянетак, які з 1961 года праводзіцца ў прыгарадзе Парыжа Шарлевіль-Мез’ер. Яна запрасіла калектыў на наступны год у Францыю, зазначыўшы: “Гэты спектакль упрыгожыць наш фэст, які будзе адзначаць сваё 50-годдзе”.

З цудоўным настроем ехалі брэстчане ў Польшчу — на XXIV Міжнародны фестываль лялечнага мастацтва ў Бельска-Бяла, дзе таксама паказалі “Месяц Сальеры”. І адразу паспяшаліся дамоў: там іх чакала не менш адказнае выступленне на VI Беларускім міжнародным фестывалі тэатраў лялек у Мінску, праграму якога завяршала апошняя прем’ера брэсцкага тэатра — “Русалачка” паводле Г.Х. Андэрсена (рэжысёр — Дзмітрый Нуянзін, мастак — Тацяна Нерсісян).

А ў чэрвені трупа была ўжо ў Празе, дзе праходзіў XIV Сусветны фестываль тэатраў лялек. Традыцыйна гэты форум вызначаецца надзвычай вялікай канкурэнцыяй. Вось і сёлета на розных сцэнічных пляцоўках горада за час фестывалю было паказана 38 спектакляў з 24 краін Еўропы, Азіі і Амерыкі. Зрэшты, гэтак жа было і ў 2006 годзе, калі першую перамогу на пражскім фэсце брэсцкія акцёры атрымалі з “Халстамерам”. Натуральна, што сёлета ім проста неабходна было “трымаць марку”. Мяркуючы па рэакцыі на “Месяц Сальеры”, ім гэта ў поўнай ступені ўдалося. “Калі пасля спектакля да нас адзін за адным пачалі падыходзіць прадстаўнікі тэатраў з Румыніі, Англіі, ЗША, — распавядае дырэктар Брэсцкага тэатра лялек Міхаіл Шавель, — і заводзіць гутарку пра тое, ці можам мы наведаць іхнія фестывалі, я штораз адчуваў гонар і за наш тэатр, і за Беларусь, якую мы прадстаўлялі. Асабліва моцна мы гэта адчулі пад час закрыцця, калі пад гучныя апладысменты залы нас віталі ўсе госці і ўдзельнікі фестывалю, бо мы — адзіныя за ўсю гісторыю фэсту, хто атрымаў Гран-пры другі раз”. Такая пачэсная перамога была адзначана яшчэ і тым, што на наступны год калектыў тэатра атрымаў запрашэнне прыняць удзел у юбілейным, XV Сусветным фестывалі тэатраў лялек, які збярэ ў сваёй афішы ўсіх пераможцаў мінулых гадоў.

— У чым жа сакрэт гэткага поспеху? — звяртаюся я з пытаннем да Міхаіла Шавеля.

— Ды ніякага сакрэту няма. Проста, патрэбна настойліва працаваць і ставіць перад сабой вялікія мэты. Гэта ў поўнай ступені адносіцца і да выбару матэрыялу для пастаноўкі, і да запрашэння тых цікавых творцаў, якія могуць нешарагова прачытаць іх, даць сцэнічнае жыццё класічным творам, што ніколі не ішлі ў лялечным тэатры. У выніку супрацоўніцтва з вядомым беларускім рэжысёрам Алегам Жугждам у нас з’явіліся спектаклі паводле твораў Марыны Цвятаевай і Міколы Гусоўскага. Сумесная праца з таленавітым расійскім рэжысёрам, лаўрэатам “Залатой Маскі” Русланам Кудашовым узбагаціла наш рэпертуар спектаклямі “Халстамер” паводле Льва Талстога і “Месяц Сальеры” А.Пушкіна. А ўдзел у міжнародных фестывалях дапамагае нам вывяраць свой мастацкі курс, знаёміцца з лепшымі набыткамі сусветнага тэатра. У сваю чаргу, па нашых выступленнях за мяжой складваецца ўражанне аб усім беларускім тэатральным мастацтве. І я магу зазначыць, што наш, айчынны, тэатр лялек — запатрабаваны і канкурэнтаздольны ў свеце.

Рыгор БАКІЕВІЧ
Брэст
На здымку: сцэна са спектакля “Месяц Сальеры”.

“Ён. Яна...” і акно ў новы сезон

Перад афіцыйным закрыццём сезона 29 чэрвеня коласаўцы запрасілі віцябчан на папулярную камедыю “Ён. Яна. Акно. Нябожчык” Рэя Куні. Спектакль, пастаўлены заслужаным дзеячам мастацтваў Расіі Юрыем Пахомавым у 2005 годзе, сыграюць 81-ы раз. Для Віцебска гэта — своеасаблівы рэкорд.

Артысты сярэдняга пакалення, занятыя ў спектаклі, кожны раз з асаблівым задавальненнем разыгрываюць гісторыю пра тое, як у гатэлі сустрэліся чыноўнік, сакратарка і... Зрэшты, сакрэты раскрывае сам спектакль. У ролі Рычарда Уіллі — Валянцін Салаўёў, Пігдэна — Георгій Лойка, сакратаркі Джэйн — Наталля Аладка, дэтэктыва выконвае заслужаны артыст Беларусі Вячаслаў Грушоў.

А 30 чэрвеня адбылася прэм’ера сезона: спектакль “О-ля-ля!”, пастаўлены рэжысёрам Юрыем Лізянгевічам па п’есе Марка Камалеці “Вось табе і Ганна!”. У галоўных ролях — маладыя артысты: Ніна Обухава, Наталля Саламаха, Андрэй Качан, Павел Давыдоўскі. А Ганну — кемлівую пакаёўку, якая прыкладае шмат намаганняў, каб захаваць сям’ю любімых гаспадароў і самой не застацца “у пралёце”, — увасабляе вядучы майстар сцэны Тамара Кабяк. Гэты спектакль завяршае 84-ы тэатральны сезон.

Наперадзе — новыя цікавыя работы: Юрый Лізянгевіч прадставіць спектакль “Вельмі простая гісторыя” Марыі Ладо, Рыд Таліпаў — “Квартэт” Рональда Харвуда, Міхась Краснабаеў адноўіць “Ладдзю роспачы”, а потым

распачне рэпетыцыі спектакля “Ноч на пароме” паводле рамана “Нельга забыць” і вершаў Уладзіміра Караткевіча. Нагадаем, што ў лістападзе 2010 года грамадскасць Рэспублікі Беларусь адзначыць 80-годдзе нашага знакамітага земляка.

Святлана ДАШКЕВІЧ,
загадчык літаратурнай часткі НАДТ імя Якуба Коласа
На здымку: сцэна са спектакля.

Бязмежная захопленасць справай, улюбёнасць у фальклор — быццам неад'емныя элементы самога паветра на фестывалі "Берагіня", што адбыўся нядаўна ў гарадскім пасёлку Акцябрскі Гомельскай вобласці. Спрыяла таму вялікая канцэнтрацыя апантаных даследчыкаў, педагогаў, дзяцей цягам усіх чатырох дзён насычанага фестывальнага жыцця. І зусім не дзіўна, што сярод вялікай колькасці новых гасцей аказалася нямала тых, хто раптам пачаў "хварэць" на беларускую аўтэнтыку, лавіць кожны гук, рух са сцэны і з насычанага чыстай, непадробнай творчасцю асяроддзя.

Калаж спадчыны ў аўтэнтычным стылі

Формула паветра "Берагіні"

VI Рэспубліканскі фестываль фальклорнага мастацтва "Берагіня" аб'яднаў дзіцячыя калектывы народных танцаў ды спеваў з усёй Беларусі, а таксама творцаў з Расіі, Украіны, Польшчы, Латвіі і Малдовы. Удзел у свяце прынялі і выканаўцы сталага ўзросту з розных рэгіёнаў: некалькі аўтэнтычных гуртоў, якія складаюцца з носьбітаў народнай культуры, паказалі прысутным сапраўдныя майстар-класы. Колькасць удзельнікаў і гасцей перавысіла 800 чалавек.

Увесь фестываль складаўся з "урокаў", што давалі адказы на пытанні: як зрабіць фальклор цікавым для дзяцей не толькі ў вёсках, але і ў гарадах, як педагогам правільна адраджаць страчаныя традыцыі, зрабіць іх працу больш прадуктыўнай ды ўдзячнай і — самае галоўнае — як захаваць чысціню мастацтва ад безгустоўнай стылізацыі. Убачыць сапраўдную нашу аўтэнтыку ў такім маштабе можна толькі на "Берагіні" — адзіным у сваім родзе фестывалі. Адзначалі гэта ў Акцябрскім і намеснік міністра культуры Рэспублікі Беларусь Тадэуш Стружэцкі, і самыя маленькія ўдзельнікі рэгіянальных калектываў.

Ім падабаецца!

Дзеці, падлеткі, студэнты, моладзь, людзі сярэдняга і сталага веку — каля фестывалю групуецца самая розная аўдыторыя, якая "гарыць" справай. Сярод яе, бадай, выглядае дзіваком той, хто лічыць фальклор з'явай, што адыходзіць і не мае будучыні. Вось маленькія артысты з годнасцю нясуць свае касцюмы, а толькі пакінуўшы сцэну — зноўку танчаць пад музыку і спевы калектыву, які на яе ўзышоў. Назіраюць, што дэманструюць іхнія малодшыя і старэйшыя калегі некалькі гадзін запар. І відавочна: яны — больш зацікаўленыя гледачы.

На VI Рэспубліканскім турніры танцавальных пар, які ў тры этапы праходзіў на фестывалі і заняў шмат напружаных гадзін, буялі эмоцыі. Дзеці трох узроставых катэгорый дэманстравалі танцавальныя традыцыі сваіх рэгіёнаў у выкананні "Полькі", "Лявоніхі", "Лысага", "Месяца", "Мікіты", "Вальса". Хтосьці — з хваляваннем і разняволенасцю, хтосьці — з выдатным валоданнем танцам або з некаторымі недасканаласцямі ў ім, з гарэзлівай весялосцю або заклапочанасцю, пад воклічы глядзельнай залы юныя танцоры паказвалі сваё ўменне. А таксама мелі шмат магчымасцей вучыцца. Старшыня журы "Берагіні" — дацэнт кафедры этналогіі і фальклору Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры і мастацтваў Вячаслаў Калацэй зазначыў, што конкурс не мае на мэце вызначыць, хто "хутчэйшы, вышэйшы, мацнейшы", а прызначаны для самаўдасканалення дзяцей.

Ці лёгка быць пераможцам?

Удзельнік танцавальнай пары — уладальніцы І месца сярод вучняў 9-х — 11-х класаў — Васіль Пузырына з Лоеўскага раёна Гомельскай вобласці згадзіўся, што вывучаць фальклор — вельмі складана: патрэбна шмат працаваць. Аднак адзначыў, што звярнуцца да эстраднай творчасці ён ужо не хацеў бы. "Народны танец — гэта маё!" — сказаў Васіль.

Асабліва шумным гарадскі сквер быў перад выкананнем карагода ды кадрылі і прэзентацыяй канцэртных праграм дзіцячых фальклорных калектываў: у кожным яго куточку адбываліся маленькія рэпетыцыі. Усхваляваныя педагогі хацелі дапамагчы калектывам і ў той час, калі яны ўжо былі на сцэне, "дырыжыруючы" з залы. Вельмі парадавалі чацвёрткласнікі з мінскай школы № 3 — удзельнікі фальклорнага калектыву "Гарлачыкі". Хоць яны, падавалася б, і найбольш адарваныя ад сельскага жыцця і носьбітаў традыцый, але іхнія звонкія спевы самі пераконвалі ў адваротным.

Мастацкі кіраўнік ансамбля Галіна Яфімава кажа, што яны павязуць дадому ажно пяць дыпломаў! "Існуём мы ўсяго тры гады. На "Берагіні" — упершыню. Было і нямала складанасцей, скажам, дзецям даводзілася тлумачыць літаральна кожнае слова. У падрыхтоўцы ж да фестывалю вельмі дапамог яго мастацкі дырэктар Мікола Козенка: ён навучыў педагогаў, а ўжо мы гэтыя веды перадаём выхаванцам. І цяпер, летам, многія бацькі тэлефануюць: просяць узяць іх дзяцей у наш першы клас. Аднойчы нават знаёмыя паведамілі, што жанчына, якая толькі нарадзіла дзіця і знаходзіцца ў радзільным доме, ужо прагне "заняць месца" для свайго малога менавіта ў нас…"

Адкрыццём на "Берагіні" стаў вельмі моцны калектыў з Гродзеншчыны — "Смаргонскія гарэзы" Смаргонскай дзіцячай школы мастацтваў імя М.К. Агінскага, што, між іншым, існуе з 1996 года: іх прызналі лідэрамі ў намінацыі "Інструментальная музыка". Скрыпкі насамрэч ажывалі ў руках дзяўчат, яны дэманстравалі непаўторную рэгіянальную традыцыю. Кіраўнік калектыву Чэслаў Жых адзначыў, што ў перамозе яны былі ўпэўнены, бо за плячыма шмат іншых фестываляў, у тым ліку і замежных. "Дзіўна, што раней мы не ведалі пра "Берагіню". Цудоўная магчымасць для беларусаў выявіць сваё, паказаць адно аднаму, чым багаты! Таму будзем расказваць пра форум іншым калектывам у нашай мясцовасці. Спачатку здавалася, што складана будзе выканаць усе ўмовы ўдзелу, аднак не так гэта і боязна. І хачу параіць усім кіраўнікам прыехаць паглядзець на гэтае свята!"

А Гран-пры прысуджана ансамблю "Жэўжык" з Любані, што на Міншчыне, пад кіраўніцтвам Сяргея Выскваркі. Існуе калектыў больш за пяць гадоў, выступаў на справаздачным канцэрце Мінскай вобласці ў Палацы Рэспублікі ў 2009 годзе. Няшмат у рэспубліцы мастацкіх кіраўнікоў, больш адданага справе ўзнаўлення мясцовага фальклору ў любой яго праяве: касцюме, танцах, спевах — чым на "Берагіні". Адзін з іх — Сяргей Выскварка. Ён амаль на ўсе імпрэзы фестывалю прыходзіў у традыцыйнай вопратцы, з'яўляючыся прыкладам для астатніх.

Значную выснову зрабіў адзін з членаў журы фестывалю — дацэнт кафедры касцюма і тэкстылю Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў Юрый Піскун: "Фестываль вырас проста фантастычна! Калі раней назіралася некалькі лідэраў, якія выдатна выяўлялі сябе ва ўсіх намінацыях, дык сёння ўсе калектывы, што прыехалі, могуць нечым здзівіць. Такая вялікая канкурэнцыя, што працаваць у журы было складана, як ніколі! Добра, што адгукнуліся ўсе рэгіёны, — гэта ўжо не кропкавая рэакцыя, а рух у рэспубліцы. Прычым многія дакладна выканалі патрабаванні канцэпцыі фестывалю, значыць, дасягнуць іх абсалютна магчыма".

Незабыўнае відовішча

Тое, што фестываль "Берагіня" скіраваны не на масавую публіку, а на ўдзельнікаў, вядома ўжо даўно. Не трацячы шмат часу на задавальненне патрэб гледача, арганізатары дабіваюцца максімальнай якасці праграмы. Жыхары Акцябрскага з радасцю "адгукаліся" на канцэрты, аднак іх было не так ужо і шмат, хаця часам здавалася, што бачыць, чуць, адчуваць моц гэтага мастацтва патрэбна кожнаму. Святочнае купальскае шэсце, якое першы раз зладзілі на фестывалі два гады таму, і гэтым разам стала такім відовішчам для гледачоў, забыцца на якое немагчыма. Энергетыка розных калектываў, што прадстаўлялі сваю творчасць адначасова, падбадзёрвала і ўзрушвала. Вялізныя вогнішчы, карагоды на лузе каля возера для многіх дзяцей сталі незабыўнымі. Моцны дождж пад час канцэртнай праграмы не прагнаў самых вясёлых, і яны разам з замежнымі ўдзельнікамі дачакаліся феерверка ды пабачылі вогнішчы на вадзе.

Госці з суседніх краін зрабілі праграму фестывалю яшчэ больш каларытнай. Асабліва прываблівалі аўдыторыю выступленні ансамбля песні і танца "Лія" пры ўпраўленні культуры Басарабянскага раённага савета Малдовы: не адводзілі вачэй ад іх скокаў ні дзеці, ні дарослыя, ні спецыялісты-навукоўцы, ні жыхары пасёлка. Кіраўніца Святлана Маляшцяну кажа, што раённыя ўлады за кошт сваіх сродкаў прыкладна раз на год даюць магчымасць калектыву выязджаць за мяжу на розныя фестывалі. І гэта вялікі стымул для жыхароў сяла Абаклія, дзе жывуць артысты. Некаторыя працуюць на будаўніцтве, стамляюцца пасля працоўнага дня, але ідуць пасля на рэпетыцыі з вялікім задавальненнем. Пэўна, таму і танчаць так бездакорна.

Не спыняцца і ставіць задачы

Кіраўнік калектыву "Biteites" з Латвіі Інга Стафецка адзначыла, што сёння ў краіне, дзе жыве 2,5 мільёна чалавек, амаль у кожным раёне ёсць з дзесятак фальклорных калектываў. Там дзеці і моладзь па ўласным жаданні ідуць спяваць, развучваць танцы, рабіць касцюмы. "На шматлікіх канферэнцыях пыталіся: як у нас так добра атрымліваецца захоўваць фальклор? Гэта складана, але я лічу, што выйсце — у навучанні дзяцей літаральна з калыскі".

За амаль 12-гадовую гісторыю існавання "Берагіні" некаторыя ўдзельнікі з дзіцячага калектыву трапілі ў студэнцкі, пасля сталі выкладчыкамі універсітэта і праз увесь гэты шлях пранеслі фальклор, робячы свой унёсак у справу яго пераймання. Мэтай сённяшніх дзяцей, што паказалі безліч выступленняў, таксама павінна стаць перадача гэтых ведаў сваім дзецям. На "круглым стале" "Традыцыйная культура і сучаснасць: Школа. Дзеці. Будучыня" выкладчык кафедры этналогіі і фальклору БДУКіМ Таццяна Пладунова выказала сваё назіранне: "Вельмі заўважна, як кіраўнік фантазіруе разам з дзецьмі. Яны быццам прывозяць сюды кавалачак сваёй зямлі, ва ўсіх намінацыях выяўляюць яе багацце. Гэта — мазаіка, калаж з тых элементаў, якімі жыве мясцовасць, і менавіта такімі мазаікамі каштоўны фестываль".

Увесь цяжар арганізацыі форуму неслі на сваіх плячах Акцябрскі раённы выканаўчы камітэт, асабліва ж — начальнік аддзела культуры Святлана Беразоўская. Падтрымалі форум Міністэрства культуры краіны, Гомельскі абласны выканаўчы камітэт, а таксама спонсар — адзін з айчынных мабільных аператараў. На прэс-канферэнцыі старшыня Акцябрскага райвыканкама Аляксандр Максіменка адзначыў, што пасёлак зрабіў усё магчымае, каб госці захацелі прыехаць сюды яшчэ раз.

Намеснік міністра культуры Тадэуш Стружэцкі заўважыў, што адным са станоўчых бакоў "Берагіні" з'яўляецца наяўнасць моцнага навукова-творчага актыву, які штораз падтрымлівае яе. Многія з іх дадаюць форуму аўтарытэт, дазваляюць яму падтрымліваць планку. Старшыня Нацыянальнай камісіі па справах UNESCO Уладзімір Шчасны чарговы раз назваў "Берагіню" адзіным фестывалем, дзе можна пазнаёміцца з традыцыйнай культурай беларусаў. "Дзеці-ўдзельнікі выконваюць важную ролю: яны захоўваюць эталон нашай нацыянальнай культуры, — і іх трэба заахвочваць, падтрымліваць".

Алена САБАЛЕЎСКАЯ,
наш спецкарэспандэнт
Мінск — Акцябрскі — Мінск
Фота аўтара

26 чэрвеня рух транспарту ў цэнтры Навагрудка быў перакрыты з самай раніцы. З гэтага моманту звыклы для горада ход падзей на пэўны час прыпыніўся. Замест машын па вуліцы Міцкевіча пад гукі дудаў павольна прасоўваліся мажныя коні з рыцарамі.

Фаер-шоу на фоне Шчытоўкі

Эпіцэнтр святкавання 600-годдзя Грунвальдскай бітвы на Беларусі наведалі міністр культуры краіны Павел Латушка, старшыня Гродзенскага аблвыканкама Сямён Шапіра, кіраўнікі дыпламатычных місій Польшчы і Літвы. Як падкрэсліў у сваім прывітальным слове губернатар Гродзеншчыны, толькі супольнымі намаганнямі нашы народы здолелі спыніць ці не самае моцнае войска тагачаснага свету.

У фэсце сярэднявечнай культуры ўзялі ўдзел калектывы з абедзвюх суседніх краін. А цэнтральнай постаццю яго адкрыцця, як і

трэба было меркаваць, стаў Вітаўт — у бліскучым выкананні Мікалая Кірычэнкі.

Некаторыя пункты праграмы наўпрост, падавалася б, не адносіліся да Сярэднявечча, але агульны дух, які панаваў цягам двух дзён на вуліцах Навагрудка, мабыць, нагадаў бы кірмашовыя фэсты той пары — калі б камусьці з нас давялося на іх пабываць.

Своеасаблівы фармат рыцарскіх імпрэз усталяваны ўжо даволі даўно, прычым менавіта ў Навагрудку, адкуль, уласна, і пайшла на іх мода ў нашай краіне. Удзень — турніры і бугурты, увечары — "культурны адпачынак": музыка, танцы, фаер-шоу. Але гэтым разам насычаная праграма імпрэзы спантанна дапаўнялася ўсё новымі і новымі пунктамі. У яе ўключаліся дудары, мастакі, народныя ўмельцы, самадзейныя тэатральныя калектывы, вулічныя музыкі... Многія прыехалі ў Навагрудак, каб "паказаць сябе", без усялякіх афіцыйных запрашэнняў. І гэта — не толькі сведчанне папулярнасці фэсту, але і яго своеасаблівая творчая "аура". Балазе ўдзячнай аўдыторыі хапала для ўсіх. Хтосьці "хварэў за сваіх" (на жаль, безвынікова) пад час беларускага этапа Еўрапейскага кубка па гістарычным фехтаванні, а хтосьці ў гэты самы час каштаваў стравы па сярэднявечных рэцэптах "у выкананні" ўдзельніц аб'яднання "Vita Melita" са Стоўбцаў або глядзеў батлейкавы спектакль.

Гала-канцэрт, які скончыўся на цэнтральнай плошчы толькі апоўначы, сабраў даволі нязвыклы для падобных імпрэз спіс удзельнікаў. Такія калектывы, як "Палац", "Нагуаль", "Аляксандра & Канстанцін", аб'ядноўвае не толькі прафесіяналізм і жывыя энергетыка выступленняў, але і імкненне да эксперыментаў, настоеных на музычных традыцыях. На жаль, такая музыка гучыць на плошчах не так і часта, хаця ў прасторы, аточанай мноствам гістарычных будынкаў, яна ўспрымалася цалкам арганічна. Амаль кожны выканаўца здолеў узяць той складаны бастыён, які называецца "масавая публіка".

Зразумела, што кірмаш прадугледжвае не толькі культурную, але і эканамічную частку. Многія беларускія прадпрыемствы скарысталі гэтую падзею для продажу або рэкламы сваёй прадукцыі — ад валёнак да інтэрактыўнага тэлебачання. Але, на жаль, галоўная сцэна фэсту, аздобленая паводле густоўнага эскіза Веніяміна Маршака, не была ўпрыгожана лагатыпамі спонсараў. З прычыны іх адсутнасці.

Напэўна, менавіта гэтай акалічнасцю быў абумоўлены эксперымент Навагрудскага райвыканкама: паспрабаваць вярнуць хаця б частку патрачаных на фэст грошай праз продаж білетаў — па рэальных, а не сімвалічных цэнах. Аднак большасць наведвальнікаў, прызвычаеныя да "бясплатнага фармату" падобных святаў, абіралі не імпрэзы на Замкавай гары, а іншыя пункты праграмы.

Хаця руіны Шчытоўкі — самы лепшы антураж для гістарычнай дзеі, які толькі можна ўявіць. "Пасланцы Сярэднявечча" з Літвы па некалькі разоў на дзень выдавалі на Замкавай гары дыхтоўную праграму з такімі неад'емнымі для "рыцарскай" тэматыкі складнікамі, як пастановачны турнір і імправізаваны майстар-клас па танцах. Добра вядомы сярод аматараў сярэднявечных танцаў усёй Еўропы польскі прыдворны балет "Cracovia Danza" паказаў прэм'еру новага спектакля менавіта ў Навагрудку.

Але хто "запаліў" па-сапраўднаму (прычым ва ўсіх сэнсах слова), дык гэта мінскі тэатр "Elemental": перад вачыма агаломшаных гледачоў на фоне мажнай вежы паўставалі дзівосныя канструкцыі, зробленыя... з агню. "Элементал" давёў усім, што фаер-шоу патрабуе не толькі тэхнічных навыкаў жанглівання, але і эстэтычнага густу. Нават традыцыйны для ўсіх святаў феерверк, які распачаўся адразу пасля выступлення тэатра, выглядаў на яго фоне не так ярка, як звычайна.

Рыцарскія двубоі пад час турніраў вікінгаў, маладых байцоў і вершнікаў былі насычаны сапраўднымі, а не тэатральнымі эмоцыямі. Адметна, што яны суправаджаліся каментарыямі вядучага, які праводзіў ненавязлівы "лікбез", датычны не толькі вагі даспехаў і даўжыні мячоў, але і беларускай гісторыі. Зразумела, што інфармацыя ў такой форме засвойваецца куды лепей, чым, скажам, на школьным уроку. Дарэчы, правільны адказ на звернутае да публікі пытанне пра дату "нараджэння" Навагрудка прагучаў дружным хорам!

Менавіта такога густоўнага вербальнага суправаджэння моцна не ставала пад час адной з цэнтральных падзей фэсту, заяўленай у праграме як інсцэніроўка Грунвальдскай бітвы. У выніку "паспалітыя гледачы", якія запоўнілі ўсю прастору паабапал замкавага рову, не заўсёды разумелі, што ж адбываецца.

Інсцэніраваць бітву з удзелам амаль пяцідзесяці тысяч ваяроў і працягласцю ў шэсць гадзін бюджэт фэсту пакуль не дазволіў — ды і ці трэба? Аднак наяўныя паказчыкі — добра, калі сотня рыцараў і працягласць меней за паўгадзіны — падаюцца ўсё ж не надта пераканаўчымі. Тым болей, дзеі бракавала не толькі маштабнасці, але таксама і рэжысуры з драматургіяй.

У той самы час, цэнтральнай навагрудскай плошчай "дырыжыраваў" Міхаіл Фінберг. І гэта не перабольшванне: здавалася, нібы стрыманыя, дакладныя рухі пальцаў маэстра мелі ўладу не толькі над аркестрам, але і над гледачамі. Трохгадзінная праграма Нацыянальнага аркестра, якая ўключала лепшыя песенныя здабыткі Беларусі, паяднала ў адзіным душэўным парыве і музыкантаў і іх шматлікую аўдыторыю.

...Фэст сярэднявечнай культуры, што дзесяць гадоў таму стаў плёнам аб'яднаных высілкаў купкі энтузіястаў — як з Навагрудскага райвыканкама, так і з рыцарскіх клубаў, — сёння сцвярджае свой статус іміджавай падзеі для ўсёй краіны. У якасці доказу гэтай высновы можна прывесці толькі адзін факт. Па словах начальніка аддзела ідэалагічнай работы Навагрудскага райвыканкама Аляксандра Гундара, на мерапрыемстве былі акрэдытаваны болей за сорак СМІ, у тым ліку і замежныя.

Ілля СВІРЫН,
Юрый ІВАНОЎ (фота),
нашы спецкарэспандэнты
Мінск — Навагрудак — Мінск

Адраджэнне і развіццё сяла: **сацыякультурны зрэз**

Памяць пра Подзвіг усяго народа — у помніках, абелісках, музеях баявой славы, выставачных музейных залах. Менавіта пра дзейнасць музеяў Ганцавіцкага раёна ў справе захавання памяці пра Вялікую Айчынную вайну і наогул — у дзейнасці па вывучэнні роднага краю і пойдзе гаворка ў артыкуле.
А пісаць ёсць пра што. У раёне, акрамя Краязнаўчага музея, ёсць Музей баявой славы Паўла Зуйкевіча. І калі ў першай ўстанове ваенным гадам адведзены толькі адзін стэнд, дык у Музеі баявой славы, што знаходзіцца ў вёсцы Лактышы, экспазіцыя больш багатая, разнастайная і распавядае не толькі пра жыццёвы ды баявы шлях разведчыка, але і пра старонкі вызвалення краю.
Зрэшты, перад намі — сапраўды рэдкі выпадак, калі раён мае адразу дзве значныя музейныя ўстановы, запатрабаваныя і мясцовымі жыхарамі, і гасцямі Ганцавіччыны, прычым кожная з іх вядзе свой кірунак захавальніцкай і даследчыцкай дзейнасці. Як ім зрабіць свой акцэнт у вывучэнні роднага краю і выхаванні сваімі сродкамі моладзі? У гэтым паспрабаваў разабрацца ў час камандзіроўкі.

Народ пытаецца і прапануе

Новы дызайн і экспанаты

І ў Ганцавічах, і ў раёне правёў невялікае сацыялагічнае апытанне жыхароў. Да збяражэння памяці пра вайну беларусы заўсёды ставяцца з павагай і разуменнем, таму і пра некаторыя праблемы ў сферы культуры з гэтай нагоды казалі, як пра свае асабістыя.

Андрэй Аркадзьевіч, жыхар Ганцавічаў:
— Адкрылі ў нас не так даўно Краязнаўчы музей. А чаму дасюль не зробяць рамонт ягонага фасада? Будынак — у цэнтры горада, а выглядае, як звычайная вясковая хатка даваенных гадоў. Заезджы турыст пройдзе і нават не здагадаецца, што гэта — музей...

Людміла, студэнтка:
— Была ў нашым музеі неаднойчы. І сама хадзіла, і сяброў, што да мяне прыязджалі, прыводзіла... На жаль, экспазіцыя — невялікая. Пастаянна наведваю новыя выстаўкі, бо хочацца паглядзець на нешта арыгінальнае. Можа, трэба як-небудзь разнастаіць і пастаянную экспазіцыю: да прыкладу, зрабіць іншы дызайн або закупіць новыя экспанаты? Бо і ваўкі, і рыбы, і старадаўнія камяні ёсць у любым раённым музеі, а хацелася б чагосьці адметнага, унікальнага, таго, чаго няма ў іншых...

Святлана, жыхарка вёскі Лактышы:
— Школу мясцовую зачынілі, але ў будынку цяпер — сельскі клуб, бібліятэка і Музей Паўла Зуйкевіча. Хочацца даведацца, ці будзе рабіцца рамонт, ці завіруе тут жыццё? Бо калі і сельскі клуб зачыняць, дык, баюся, каб не атрымалася, што наша вёска акажацца "неперспектыўнай". І музей нам патрэбны, бо ў вёску часта прыязджаюць, менавіта каб яго наведаць, асабліва — улетку. А будынак школы — вялікі, месца там хапае. Можа, варта вольныя памяшканні прыстасаваць пад нешта цікавае?..

Інтрыга вясковай хаціны

Па прыездзе ў райцэнтр скіраваўся ў мясцовы Краязнаўчы музей. Дарэчы, побач з ім знаходзіцца Брацкая магіла савецкіх воінаў і партызанаў: тут пахаваны 187 чалавек, якія загінулі пад час баявых дзеянняў у Вялікую Айчынную вайну. Зрання і да позняга вечара ўсе два дні, пакуль я знаходзіўся ў Ганцавічах, там шчыравалі рабочыя: добраўпарадкаванне тэрыторыі каля помніка — адзін з важных этапаў падрыхтоўкі да агульнараённага святкавання Дня вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

Краязнаўчы музей — гэта звычайная вясковая хаціна: выгляд у яго не надта прэзентабельны, хаця якраз ён і перадае гістарычнае аблічча будынка такім, якім яно было ў 1930-я гады. Як распавяла мне дырэктар установы Ала Занька, у хуткім часе кіраўніцтва аддзела культуры паабяцала зрабіць рамонт фасада будынка. Але гэта — у будучым... Што ж можа прапанаваць музей турысту ўжо сёння?

На першы погляд — не так ужо і шмат. У музеі, адкрытым у 2002 годзе, — пяць залаў, чатыры з якіх прыстасаваны пад пастаянную экспазіцыю, а яшчэ адна — для зменных выставак. Шмат якія падобныя ўстановы краіны, дзе даводзілася бываць у журналісцкіх камандзіроўках, прапаноўваюць наведвальніку "тыпавы" маршрут: экскурсавод распавядае пра стаянкі старажытных людзей, знойдзеныя ў той або іншай мясцовасці раёна, спыняецца на этнаграфічных ды прыродных цікавостках краю, а пасля пераходзіць да расповеду пра раённы цэнтр — з часоў яго заснавання і да нашых дзён...

Не стаўся выключэннем і Ганцавіцкі раённы краязнаўчы музей. Хаця ёсць тут і свае арыгінальныя экспанаты: прывезены з Брэста бівень маманта, насценны гадзіннік, падораны Аляксандрам III рабочаму чыгуначнай станцыі, разнастайныя старадаўнія ліхтары...

Зрэшты, менавіта такі, падавалася б, стандартны набор абмінаць не тое што немагчыма, але і не варта. Ён выступае тым стрыжнем, ад якога адштурхоўваюцца і ўсе крэатыўныя пачынанні. Іншая справа, што дэманстраваць наяўныя фонды можна неяк па-асабліваму. Скажам, пры дапамозе адпаведнай сучаснай тэхнікі.

3-за таго, што ва ўстанове няма ні ўласнай відэакамеры, ні мультымедыйнай устаноўкі, каб прадстаўляць наведвальнікам прэзентацыі па той або іншай тэматыцы, яна даволі падобная да сваіх "сясцёр" у іншых раёнах Беларусі. Бо менавіта выкарыстанне сучасных тэхналогій дазваляе казаць пра музей якраз XXI стагоддзя. Але, кажучы па праўдзе, наракаць на дрэннае матэрыяльнае забеспячэнне не выпадае: у музеі ёсць два камп'ютэры з падключэннем да Інтэрнета, сканер і прынтэр.

Пра тое, што ў музеі павінны быць найноўшыя сродкі мультымедыя, наша газета пісала неаднойчы. Разумеюць гэта і ў Ганцавічах. Але часцей за ўсё прычына адсутнасці падобных рэчаў у раённых музеях Беларусі, як і ў Ганцавічах, — банальная: недахоп грошай. Праўда, установа працуе і зарабляе добра: за 2009-ы тут выйшлі на паказчык у пяць мільёнаў рублёў, за першыя ж пяць месяцаў бягучага года зарабілі ўжо каля трох. Калі б гэтыя сродкі накіроўваліся непасрэдна на развіццё ўстановы культуры (маю на ўвазе набыццё неабходнай апаратуры), магчыма, музей змог бы прывабіць сваімі экскурсіямі нашмат болей наведвальнікаў.

Дзённік партызана

Вярнуся да тэмы Вялікай Айчыннай вайны ў дзейнасці мясцовых музейшчыкаў. Пра гэты час у раённай установе, як ужо казаў, распавядае толькі адзін стэнд з некалькімі экспанатамі. Сярод іх асаблівую цікавасць можа выклікаць дзённік успамінаў камандзіра партызанскай брыгады, якая дыслацыравалася ў ганцавіцкіх лясах. Тым не менш, у агульным рэчышчы экспазіцыі гэтая старонка не губляецца, а яшчэ раз сведчыць пра маштабы і задачы ўстановы як асветніцкага цэнтра з самым шырокім зместам. Якраз ён, і ў кантэксце сённяшняга свята, зберагае памяць пра мінулае нашай зямлі і, дзякуючы скіраванасці на маладое пакаленне ды сучаснасць, глядзіць у заўтрашні дзень.

Таму не дзіўна, што падрыхтавалі музейшчыкі да сённяшняга дня і сваю праграму менавіта ў наступным кантэксце: 3 ліпеня ля свайго будынка яны ладзяць выстаўку "Ганцавічы: падарожжа ў часе", дзе будуць прадстаўлены экспанаты з фондаў.

Таксама пры цесным узаемадзеянні з музеем у раёне дзейнічаюць пяць экскурсійных маршрутаў, адзін з якіх — па ваеннай тэматыцы: гэта вандроўка па месцах воінскіх пахаванняў у саміх Ганцавічах і наваколлях. Таксама ў межах адной з экскурсій турысты наведваюць Музей баявой славы разведчыка Паўла Зуйкевіча...

Ва ўсёй гэтай дзейнасці — вялікая заслуга дырэктара раённага краязнаўчага музея Алы Занька. Яна — таленавіты арганізатар, які можа скіраваць працу сваіх супрацоўнікаў у патрэбнае рэчышча, што заўсёды прыносіць плён. Да таго, як стаць дырэктарам краязнаўчага музея, Ала Васільеўна працавала загадчыкам клуба ў вёсцы... Ганцавічы (яна размешчана за тры кіламетры ад горада). Арганізавала ў тым жа населеным пункце ў 1996 годзе Дом народнай творчасці, а ў 2000-м — Музей сялянскага падвор'я пад адкрытым небам, дзе паказаны побыт вяскоўца пачатку XIX стагоддзя.

Так што вопыту арганізатарскай дзейнасці Але Васільеўне не займаць. Але адпаведнай адукацыі ні яна, ні астатнія супрацоўнікі музея — а ёсць тут яшчэ старшы навуковы супрацоўнік, галоўны захавальнік фондаў і наглядчык — не маюць. Да таго ж, ва ўстанове маецца вакантнае месца навуковага супрацоўніка. Яго абавязкі часова выконвае дырэктар музея.

Яшчэ адна вялікая музейная праблема — недахоп плошчаў. З-за гэтага немагчыма прадставіць некаторыя прадметы з фондасховішча, ды і сам пакой для захавання фондаў не вельмі вялікі.

Подзвіг разведчыка

Натуральна, Раённы краязнаўчы музей не павінен засяроджвацца толькі на ваеннай тэматыцы. Для гэтага існуюць іншыя тыпы ўстаноў культуры — музеі баявой славы.

Падобная ёсць і на Ганцавіччыне. Дарэчы, музей баявой славы — з'ява даволі унікальная для раёнаў рэспублікі. Зрэшты, як сведчыць статыстыка, сёння, на жаль, не кожны раён мае і краязнаўчую ўстанову.

Музей, што носіць імя Зуйкевіча, стала размешчаны ў вёсцы Лактышы, у будынку былой сельскай школы, якую летась зачынілі. Дарэчы, у тым жа будынку знаходзіцца цяпер і сельскі клуб з даволі цікавым музеем, дзе прадстаўлены рыбы, што водзяцца ў мясцовай рацэ Лані, — плён працы аб'яднання "Аквафіл", — а таксама сельская бібліятэка. Але спыню ўвагу на Музеі баявой славы, тым больш, распавесці тут ёсць пра што.

Хаця б таму, што музейная ўстанова распавядае пра лёс разведчыка, ураджэнца вёскі Лактышы, Паўла Рыгоравіча Зуйкевіча, якога за баявыя заслугі Урад Чэхаславацкай ССР пасмяротна ўганараваў найвышэйшай ўзнагародай сваёй краіны — Ваенным крыжам.

Малады чалавек — на пачатку вайны Паўлу было васемнаццаць гадоў — удзельнічаў у партызанскім руху на Ганцавіччыне, трапіў у нямецкі палон, адкуль збег і пасля ваяваў у партызанскім атрадзе на Украіне. У 1944-м яго накіравалі на курсы радыстаў, а ў сакавіку 1945-га закінулі глыбока ў тыл ворага, у наваколле сталіцы Чэхіі, адкуль ён перадаваў звесткі пра дыслакацыю нямецкіх войскаў.

Але фашысты змаглі запеленгаваць рыдыёстанцыю савецкага разведчыка. 7-га красавіка 1945 года, не дажыўшы ўсяго крыху больш за месяц да канца вайны і паўгода да свайго 23-га дня нараджэння, Павел Зуйкевіч быў акружаны фашыстамі і загінуў у няроўным баі.

Установа, што зберагае Памяць і глядзіць у будучыню

Знайсці свой

Райвыканкамаўская "лятучка" з "К"

Будынак, у якім месціцца Ганцавіцкі раённы краязнаўчы музей.

Пра ўсё гэта мне распавяла загадчык Музея баявой славы ў вёсцы Лактышы Надзея Мышкавец. На жаль, усе асабістыя рэчы Паўла Зуйкевіча згарэлі пад час бамбёжкі Лактышоў. Таму ва ўстанове культуры можна пабачыць некаторыя прадметы, што належалі баявым таварышам разведчыка, а таксама дакументы. Тут можна даведацца пра тое, як і хто вызваляў Ганцавіччыну ў 1944 годзе...

Па словах загадчыка музея, цяпер да іх не так ужо і часта прыязджаюць з экскурсіямі: зарабляе ўстанова ў месяц прыкладна 50 — 60 тысяч, хоць летам наведвальнікаў больш, чым у асенне-зімовы перыяд.

Магчыма, гэта адбываецца таму, што ў музеі не вельмі шмат экспанатаў, і экспазіцыя даўно (а музей быў адкрыты пры школе ў 1984 годзе) не абнаўлялася.

У абмеркаванні закранутых пытанняў прынялі ўдзел старшыня Ганцавіцкага раённага выканаўчага камітэта Уладзімір СТОЛЯР і начальнік аддзела культуры Ірына МАРЦІНКЕВІЧ.

Юрый ЧАРНЯКЕВІЧ:
— Уладзімір Міхайлавіч, артыкул, прысвечаны Ганцавіцкаму раёну, выходзіць якраз 3-га ліпеня — у Дзень незалежнасці Рэспублікі Беларусь і ў 66-ю гадавіну вызвалення краіны ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Што з культурных мерапрыемстваў запланавана ў горадзе?

стрыжань для раённага музея

Уладзімір СТОЛЯР:

— Як заўсёды, пройдуць мітынг на галоўнай гарадской плошчы, ускладанне кветак да Брацкай магілы. Будзем казаць і пра тое, чаго мы дасягнулі за той час, калі зрабіліся самастойнай дзяржавай. Менавіта ў такім накірунку і плануецца ладзіць мерапрыемствы ў гэты дзень: паказваць здабыткі Ганцавіцкага раёна. Дарэчы, як і ў мінулыя гады, адзін з рэжысёраў свята — Ірына Марцінкевіч.

Юрый ЧАРНЯКЕВІЧ:

— Напачатку скірую гутарку ў бок ваеннай тэматыкі. Як і ў кожным раёне Беларусі, ёсць і на Ганцавіччыне помнікі салдатам-вызваліцелям, а таксама мірным жыхарам, якія былі расстраляны карнікамі, ёсць і свае гістарычныя аб'екты, звязаныя з вайной…

Уладзімір СТОЛЯР:

— Не так даўно, у 2005-м, адкрылі помнік на сёмым кіламетры дарогі Ганцавічы — Хатынічы, дзе ў 1941 годзе былі расстраляны каля 300 яўрэяў. Ён паўстаў менавіта за сродкі раённага бюджэту.

Ірына МАРЦІНКЕВІЧ:

— А ўсяго ў раёне — 19 помнікаў, 17 з іх прысвечаны Вялікай Айчыннай вайне, 2 — воінам-афганцам. Усе яны дагледжаны, і стан іхні пастаянна кантралюецца.

Юрый ЧАРНЯКЕВІЧ:

— Не магу не спытаць пра Ганцавіцкі раённы краязнаўчы музей. Экспазіцыя, прысвечаная ваеннай тэматыцы, там не надта вялікая…

Уладзімір СТОЛЯР:

— Але, адзначу, у некаторых рэгіёнах краязнаўчага музея ўвогуле няма. А мы свой утрымліваем за раённыя грошы.

Ірына МАРЦІНКЕВІЧ:

— Па вялікім рахунку, на будучае трэба падумаць аб тым, каб размясціць музей у іншым, большым, будынку.

Уладзімір СТОЛЯР:

— Але на сёння горад вольных будынкаў не мае…

Юрый ЧАРНЯКЕВІЧ:

— Пакоі — маленькія, і шмат матэрыялаў там не размесціш. Да таго ж, мала месца для музейных фондаў: пакой фондасховішча — таксама невялікі. А там жа — каля 3000 адзінак у асноўным фондзе, і амаль 2600 — у дапаможным…

Уладзімір СТОЛЯР:

— Галоўнае — што музей размешчаны ў цэнтры горада, таму ніякі турыст яго не абміне. І не абмінае.

Ірына МАРЦІНКЕВІЧ:

— Была задума размясціць музей непадалёк ад горада — там, дзе былі вольныя вялікія будынкі, але мы адмовіліся ад гэтага.

Юрый ЧАРНЯКЕВІЧ:

— Усё ж музею патрэбны рамонт, яшчэ хаця б адно памяшканне для размяшчэння фондаў…

Уладзімір СТОЛЯР:

— Галоўнае — каб у такім музеі ішла праца. А яна ідзе, і я працай музейных супрацоўнікаў задаволены. Але, канешне ж, планаваць такое пашырэнне станем абавязкова.

Ірына МАРЦІНКЕВІЧ:

— Выдаткаваны грошы на трэці квартал бягучага года — 10 мільёнаў рублёў: будзем рамантаваць фасад будынка.

Уладзімір СТОЛЯР:

— Думалі над тым, каб выкарыстаць пры рамонце сучасныя матэрыялы, але вырашылі пакінуць усё без змен. Пластык, пагадзіцеся, не пасуе краязнаўчаму музею…

Ірына МАРЦІНКЕВІЧ:

— А фондасховішча, хутчэй за ўсё, размесцім у Дзіцячай школе мастацтваў, дзе ў нас дастаткова месца. Ці ёсць яшчэ адзін варыянт: на другім паверсе гарадскога Дома культуры, які месціцца побач.

Юрый ЧАРНЯКЕВІЧ:

— Ёсць ва ўстанове і вакантнае месца навуковага супрацоўніка. Дарэчы, усе музейныя работнікі не маюць спецыяльнай адукацыі…

Ірына МАРЦІНКЕВІЧ:

— Так, і гэта насамрэч праблема. Але я чакаю жніўня: да нас павінен прыйсці спецыяліст з БНТУ, археолаг. Ён, хутчэй за ўсё, зойме месца навуковага супрацоўніка музея, адказнага за ахову гісторыка-культурнай спадчыны.

Юрый ЧАРНЯКЕВІЧ:

— А ці чакае рамонту Музей баявой славы Паўла Зуйкевіча ў вёсцы Лактышы?

Уладзімір СТОЛЯР:

— Наколькі я ведаю, у Лактышах трэба рабіць рамонт, і аддзел культуры ўжо распачаў гэтую працу.

Ірына МАРЦІНКЕВІЧ:

— Сіламі гаспадарчай групы аддзела ўжо адрамантавана глядзельная зала, будзем даводзіць да ладу яшчэ шэраг кабінетаў. Выкарыстоўваем пазабюджэтныя сродкі і тыя, што выдаткаваны на бягучы рамонт устаноў культуры.

Юрый ЧАРНЯКЕВІЧ:

— Якія перспектывы ў гэтай вясковай установы?

Ірына МАРЦІНКЕВІЧ:

— Гэта былы будынак школы, мы перавялі туды сельскі клуб і бібліятэку. Мяркуем зрабіць тут музейна-спартыўны комплекс. У дадатак да тых музеяў, што там працуюць, мы перанясём з Дома рамёстваў пакой здаровага ладу жыцця. Значыць, пад адным дахам будзе тры музеі! Карацей, — на любы густ і на любога, нават самага патрабавальнага, турыста. У школе даволі вялікая спартыўная зала. А ў Лактышах размешчаны рыбгас. Вельмі часта туды на рыбнае "паляванне" прыязджаюць турысты з Мінска, Баранавічаў, Ляхавічаў. Таму плануем адрамантаваць шэраг пакояў у гэтым будынку і прыстасаваць іх пад гасцінічныя нумары.

Юрый ЧАРНЯКЕВІЧ:

— Ведаю, што пад Дзяніскавічамі стаяла партызанская брыгада імя Леніна. Ці існуе задума стварыць нешта накшталт экспазіцыі пад адкрытым небам, ладзіць туды экскурсіі, праводзіць тэатралізацыі, частаваць турыстаў юшкай або салдацкай кашай? Шмат грошай на гэта не спатрэбіцца. Да таго ж, не трэба скідваць з рахункаў і выхаваўча-патрыятычны складнік, ідэалагічны. Менавіта падобны Музей партызанскага побыту пад адкрытым небам ужо доўгі час існуе ў Расонскім раёне, дзе не так даўно давялося пабываць у камандзіроўцы…

Ірына МАРЦІНКЕВІЧ:

— Увогуле, ідэя — вельмі цікавая, і трэба сказаць, што мы пра гэта ўжо думаем. Каля Ясенца стаялі партызаны, гэта якраз па дарозе на Лактышы. Дык мы плануем у наступным годзе зрабіць там у лесе зямлянкі: гэтая праца сапраўды не патрабуе вялікіх фінансавых выдаткаў. Наладзім і турмаршрут: будзем вазіць турыстаў у Лактышы, дзе мяркуем размясціць музейна-спартыўны комплекс, потым — у Ясянец, дзе ёсць пахаванні, а канцавым прыпынкам стануць партызанскія зямлянкі. Плануем задзейнічаць нашых артыстаў з навакольных дамоў культуры; будуць вогнішча, юшка, салдацкая каша…

Уладзімір СТОЛЯР:

— Пра вайну не забываемся ніколі. Пры ГДК у нас ёсць хор народных ветэранаў — адзін з лепшых калектываў раёна. Як 3 ліпеня, так і 9 мая кожнаму ветэрану вайны ўручаюцца падарункі ад райвыканкама. Мы думаем і пра сучаснасць. Таму, натуральна, не толькі захоўваем і ўвекавечваем Подзвіг нашых бацькоў і дзядоў, але і паказваем сённяшнія дасягненні, сваю самабытнасць, у тым ліку і культурную. Неабходна казаць, да прыкладу, пра хатыніцкіх спевакоў з народнага фальклорна-этнаграфічнага гурта "Хатовічы", што выступаюць на сваёй мясцовай гаворцы, пра пастуха, які ідзе з торбачкай, дзе вышыты беларускі арнамент. І — пра моладзь, што не цураецца ні беларускай культуры, ні беларускай мовы. У гэтым бачу галоўнае: у тым, каб заўсёды заставалася непарыўнай повязь пакаленняў.

Юрый ЧАРНЯКЕВІЧ,
наш спецыяльны карэспандэнт
Мінск — Ганцавіцкі раён — Мінск
Фота аўтара

На райвыканкамаўскай "лятучцы": старшыня Ганцавіцкага раённага выканаўчага камітэта Уладзімір Столяр і начальнік аддзела культуры Ірына Марцінкевіч.

Дэталь да агульнай карціны

Каго ведае ўвесь раён?

У межах артыкула не магу не распавесці хаця б сцісла пра чалавека, якога, без перабольшання, ведаюць усе ў Ганцавічах. Гэта Вольга Іванаўна Задзяркоўская, удзельніца Вялікай Айчыннай вайны.

Яна два гады — з 1942-га па 1944-ы — была ў шэрагах тых, хто вызваляў Радзіму ад карычневай чумы. Скончыўшы ў 1942 годзе курсы сувязістаў, Вольга Задзяркоўская служыла ў чатырнаццатай асобнай роце сувязі 22-й гвардзейскай Данбаскай Чырванасцяжнай бамбардзіровачнай дывізіі.

Пасля вайны працавала на чыгуначнай станцыі, скончыла Ганцавіцкае педвучылішча і доўгі час была настаўніцай. Выйшаўшы на пенсію, Вольга Задзяркоўская вырашыла напісаць успаміны пра сваё жыццё. Гэты каштоўны матэрыял, а таксама звесткі па гісторыі пасляваеннай Беларусі (выразкі з газет, шматлікія фотаздымкі) Вольга Іванаўна карпатліва збірала і збірае па сёння; цяпер у ейным архіве — больш за 20 сшыткаў, своеасаблівы хатні музей. Было б, вядома, няблага, каб усе гэтыя каштоўныя дакументы папоўнілі з цягам часу фонды Раённага краязнаўчага музея.

Да таго ж, Вольга Задзяркоўская — актыўны ўдзельнік творчай самадзейнасці: была адным з арганізатараў стварэння ў 1986 годзе народнага хору ветэранаў, што дзейнічае пры Ганцавіцкім ГДК. А яшчэ Вольга Іванаўна займаецца вышыўкай і ткацтвам.

На здымку: сцяг, што трымае ўдзельніца Вялікай Айчыннай вайны, сшыты ёй яшчэ ў далёкім 1956-м. І больш за 20 гадоў гэтае палотнішча выносілася рабочымі чыгуначнай станцыі "Ганцавічы" на парады, мітынгі і шэсці.

Пасляслоўе да райвыканкамаўскай "лятучкі"

Жалуды партызанскай школы

Галоўны спецыяліст упраўлення ўстаноў культуры і народнай творчасці Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь Святлана ГАЎРЫЛАВА:

— У праект Дзяржаўнай праграмы развіцця культуры і мастацтва на 2011 — 2015 гады закладзены ўсе тыя прапановы, якія прадставілі нам абласныя ўпраўленні культуры па развіцці музейных устаноў у сваіх рэгіёнах. У тым ліку гэта датычыцца і набыцця мультымедыйных сродкаў.

Цяпер музеі працуюць згодна з "Праграмай развіцця музейнай справы ў Рэспубліцы Беларусь на 2005 — 2010 гады". І калі гаварыць пра Брэсцкую вобласць — там ёсць шматлікія прыклады сапраўднага крэатыву. Маю на ўвазе, напрыклад, музей "Бездзежскі фартушок" на Драгічыншчыне, а таксама Бярозаўскі краязнаўчы музей. Дарэчы, музей у Бярозе прызнаны лепшай установай 2009 года ў намінацыі "Музейна-педагагічны занятак". Мясцовыя супрацоўнікі назвалі яго "Літары на бярозавай кары" і прысвяцілі 65-годдзю вызвалення Беларусі: школьнікі тут могуць папрацаваць на партызанскай рацыі, пазаймацца матэматыкай з дапамогай жалудоў і яловых шышак…

Што да праблемы з фондасховішчам, якая ёсць у Ганцавіцкім краязнаўчым музеі, дык, згодна з той жа дзеючай праграмай, прадугледжана паляпшэнне ўмоў працы і аховы музейных фондаў у кожнай вобласці Беларусі, у тым ліку і на Брэстчыне. На гэта накіроўваюцца сродкі з абласных бюджэтаў.

Аўтар і вядучая рубрыкі —
Надзея БУНЦЭВІЧ

Да Радзівілаў за оперным багаццем

“Вечары оперы і балета ў замку Радзівілаў” — адбыліся і сталі першым фестывальным праектам адноўленага Нацыянальнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета Беларусі. Разам са святамі камернай музыкі “Музы Нясвіжа”, што цягам вось ужо 15-ці гадоў ладзяцца тут Нацыянальным канцэртным аркестрам нашай краіны, “Вечары...” склалі гэткі “нясвіжска-фестывальны дыялог”.

“Пралогам” да гэтага опернага фестывалю стала, вядома, прэс-канферэнцыя, у якой узялі ўдзел намеснік генеральнага дырэктара тэатра Валерый Гедройц, заслужаны артыст Беларусі Віктар Скорабагатаў, дырыжор Вячаслаў Воліч і дырэктар Нацыянальнага гісторыка-культурнага музея-запаведніка “Нясвіж” Валерый Сталярчук.

Опера Яна Голанда “Чужое багацце нікому не служыць”, а другім вечарам — балет “Шапэніяна” і гала-канцэрт былі паказаны на меншай, у параўнанні з тэатрам, сцэне. А галоўнае — у новым навакольным антуражы, апынуўшыся быццам “замкнёнымі ў адно кола” ўнутраным дворыкам Нясвіжскага палаца. Ці не пра такую еднасць з залай і самой прыродай марыць кожны артыст?

Таму не дзіва, што ўжо цяпер арганізатары праекта вынеслі свой вердыкт: гэтаму фестывалю — быць! І праз год, і надалей. Сёння ўжо вядома, што будзе паказана тут у 2011-м: опера Уладзіміра Солтана “Дзікае паляванне караля Стаха”, балет “Трыстан і Ізольда” на музыку Рыхарда Вагнера і, ужо паводле традыцыі, гала-канцэрт. Тым больш, што і сам Нясвіжскі палац плануецца ператварыць у шматфункцыянальны культурны цэнтр. Невялічкая тэатральна-канцэртная зала на сотню месцаў з’явіцца і ў самім палацы, “дапоўніўшы” ўласна музейную экспазіцыю. “Паселіцца” ў замку і арган. А ў Ратушы, дзе цяпер праходзіў яшчэ адзін фестывальны канцэрт (гэткі “дуэтны сольнік” Таццяны Трацяк і Станіслава Трыфанава), праз час з’явіцца батлейка. Дый вулічна-“дворыкавыя” канцэрты, як гэта было зараз, тут можна праводзіць не толькі раз на год у межах фестывальнага мерапрыемства, але і часцей, з мая па верасень, зрабіўшы неад’емнай часткай “немузейна-музейнай” экспазіцыі.

На здымках: пад час гала-канцэрта; у “глядзельнай зале”.

“Начны дазор” па-шапэнаўску

Цікавасць да новага праекта Беларускай дзяржаўнай філармоніі “Ноч музыкі” была вялізнай. Такі праект ладзіўся ў нас упершыню: больш як пяцігадзінны мастацкі марафон, прычым складзены не з эстрадных твораў, а з канцэпцыйных музычных, харэаграфічных, тэатралізаваных нумароў розных эпох, пра-цяглас-ці, і ўсё — у гонар Шапэна.

Не меншую цікавасць выклікала і асоба кампазітара Ларысы Сімаковіч. Працуючы ў рэкламна-інфармацыйным аддзеле філармоніі, гэтая рознабакова адораная, папраўдзе таленавітая творца выступіла аўтарам і нават бенефіцыянткай вечарыны. Бо яна не толькі прыдумала ідэю і стала галоўным ініцыятарам “начнога музіцыравання”, але і распрацавала сцэнарый, напісала вядучым тэксты, выступіла ў якасці аўтара п’есы, рэжысёра, харэографа-пастаноўшчыка і выканаўцы адной з цэнтральных роляў музычнага спектакля “Жорж Санд, мазурка і Шапэн”, а таксама стварыла адну з васьмі фінальных калыханак у гонар Шапэна (і пры гэтым зацікавіла сямёра астатніх кампазітараў, каб тыя напісалі свае калыханкі, кожны — на свой лад).

Але ж ноч на тое і ноч, што ў ёй многае “дзённае” (а разам з ім і будзённае) успрымаецца іначай. Дый больш як пяць гадзін музыкі запар, хай і з невялікімі антрактамі, аказаліся не абы-якім выпрабаваннем для гледача. Ды толькі, падаецца, варта больш разлічваць арганізатарам такога канцэрта, хто стане тым самым гледачом: прэм’еры васьмі новых партытур завяршыліся бліжэй да першай гадзіны ночы, ды яшчэ ў ноч з серады на чацвер. Вось і сыходзіла публіка раней за час “даслухоўваць” свае калыханкі дадому. Тым больш, што паспела “зачаравацца” ў зале пад час даволі медытатыўнага выступлення амерыканскай скрыпачкі Крысціны Фонг.

Затое як запаліў прысутных варшаўскі гурт “Zespol Polski”! Тое, што ён прадэманстраваў, можна азначыць хіба фразай: “І немагчымае — магчыма!”. Бо аўтэнтычныя народныя інструменты спалучаліся з музыкай Шапэна ў джазавай апрацоўцы і, галоўнае, такой энергетыкай, што здольная была б, здаецца, уваскрэсіць вялікага класіка!

Адточанае класічнае выкананне шапэнаўскай музыкі дэманстравалі нашы піяністы. Атрымаўся сапраўдны “фартэпіянны парад” (ці, можа, гэткая “фартэпіянная нарада”, бо раялі часам станавіліся “ў кола” — амаль як удзельнікі Клуба вясёлых і знаходлівых у час абмеркавання).

Безумоўна, упрыгожылі вечар артысты балета. Юлія Дзятко, Надзея Філіпава, Рына Івакіры, Рыгор Крукоўскі і Ігар Вяршынін паказалі тры мініяцюры, пастаўленыя Раду Паклітару. А вось спектакль “Жорж Санд, мазурка і Шапэн”, таксама насычаны пластыкай, выклікаў самыя супрацьлеглыя меркаванні. Можа, начны час не садзейнічаў заглыбленню ў яго сімволіку?

Як бы тое ні было, першы блін атрымаўся зусім не камяком: былі ў ім сапраўдныя “разыначкі”, перлінкі і нават дыяменты. Але агульную драматургію такіх “начных дазораў” трэба ўсё ж адбудоўваць больш узважана.

Фота Ігара КУЗНЯЦОВА
На здымках: Надзея Філіпава; дырыжыруе Яўген Бушкоў.

Санджа, ды не на банджа

У жанры “ўсходняга фэнтэзі”

Знаёмства з традыцыйнай культурай таго або іншага народа свету не заўсёды бывае набліжаным да сапраўдных вытокаў: здараецца, гледачу прапануюць ужо адаптаванае пад яго густ відовішча, заснаванае не столькі на фальклоры, колькі на яго разнастайных апрацоўках і стылізацыях. Іншая справа — канцэрт “Карэя, агучаная душа” ў Беларускай дзяржаўнай філармоніі, які меў не толькі мастацкае, але і папраўдзе навуковае начынне: нам было прапанавана аўтэнтычнае выкананне жанраў, унесеных UNESCO ў Спіс нематэрыяльных культурных каштоўнасцей і нават названых шэдэўрам вуснай нематэрыяльнай спадчыны чалавецтва.

“джаз” — імпрэзаваны жанр санджа, дзе граюць на ўсіх гэтых і многіх іншых інструментах. А колькі адметнай пластыкі было ў кожным руху! Прычым не толькі ў танцораў, але і ў спевакоў, музыкантаў-інструменталістаў. Ды ўсё ж самае, бадай, вялікае ўражанне пакінулі самі жанры народнай і прафесійнай культуры.

Арганізатарамі шыкоўнай прэзентацыі выступілі Пасольства Рэспублікі Карэя ў Рэспубліцы Беларусь, Кіраўніцтва культурнай спадчынай і Фонд абароны культурнай спадчыны Карэі, а таксама Міністэрства культуры нашай краіны. Госці зрабілі ўсё магчымае, каб гледачы не толькі атрымалі асалоду ад экзотыкі, але і заглыбіліся ў сутнасць прапанаваных ім фальклорных нумароў. У фае можна было атрымаць буклеты з падрабязнай інфармацыяй не толькі пра выканаўцаў, але і пра самі жанры, узоры якіх склалі праграму. Самыя значныя факты агучваліся і вядучай. Кожны вакальны нумар суправаджаўся тэкстам, які з’яўляўся на экране сінхронна выкананню.

Адкрыццяў нават для знаўцаў было — безліч! Гэта, вядома, разнастайныя народныя інструменты, сярод якіх ёсць папраўдзе унікальныя. Да прыкладу, тэгым — карэйская бамбукавая флейта, якую трымаюць не злева направа, як звычайную, а ў адваротны бок ды яшчэ і кладуць на плячо. Або хэгым, што чымсьці нагадвае вялізную перакуленую люльку, адкуль замест дыму ідуць чароўныя гукі, якія здабываюцца смыкам усяго на дзвюх струнах. Не менш цікавымі аказаліся і іншыя струнныя, у тым ліку аналагі цытры: на адных граюць пальцамі, быццам pizzicatto, на другіх — спецыяльнай палачкай, як своеасаблівым медыятарам, на трэціх — смыкам, што трымаюць, акурат як пілу. Пачулі мы і карэйскі “джаз” — імпрэзаваны жанр санджа, дзе граюць на ўсіх гэтых і многіх іншых інструментах. А колькі адметнай пластыкі было ў кожным руху! Прычым не толькі ў танцораў, але і ў спевакоў, музыкантаў-інструменталістаў. Ды ўсё ж самае, бадай, вялікае ўражанне пакінулі самі жанры народнай і прафесійнай культуры.

Традыцыйная карэйская опера (пансоры) — гэта сапраўдны “тэатр аднаго спевака” ў суправаджэнні гэткага “барабаншчыка-аркестра”. Літаральна паварот галавы — і ўсё: перад намі — іншы персанаж, які гаворыць і спявае сваім адметным тэмбрам, сваімі адметнымі інтанацыямі. Адзіны ўзмах веерам — і перад намі ўжо ўвогуле не мужчына, а жанчына. Фэнтэзі, дый толькі!

Не менш сінтэтычным па сваёй прыродзе аказаўся і танец будыйскіх манахаў (сынгму). Кожная дэталь у ім, як і ва ўсёй усходняй культуры, мае глыбокі філасофскі сэнс. Ад выканаўцы ж патрабуецца не толькі харэаграфічнае майстэрства, але і ўласна музычнае, бо завяршаецца танец мудрагелістым, поўным сімволікі рытмам барабанных палачак, які выконвае сам танцоўшчык — адначасова са скокамі.

Асабіста я атрымала ва ўсім гэтым яшчэ і разгадку цяперашняга “карэйскага сіндрому”: чаму карэйскія музыканты так упэўнена перамагаюць на ўсіх класічных еўрапейскіх і сусветных конкурсах. Не толькі з-за сваёй упартасці ў спасціжэнні еўрапейскай класікі, але і дзякуючы беражліваму захаванню нацыянальнай спадчыны. Бо пасля інтанацыйных і рэгістравых складанасцей такога прафесійнага вакальнага жанру, як кагок, ніякія адмысловыя тэхнікі еўрапейскага авангарда не страшныя!

“Еўрабачанне” без праблем

Госцем сталіцы чарговы раз стаў выканаўчы прадзюсер Еўрапейскага вяшчальнага саюза Свантэ Стакселіюс. Ён засведчыў: дзіцячае “Еўрабачанне” ў Мінску адбудзецца пры любых абставінах!

Сапраўды, Еўропа, як і ўвесь свет, перажывае не лепшыя фінансавыя часы: тое ж танцавальнае “Еўрабачанне” не склалася сёлета менавіта з-за гэтых прычын, бо многія краіны не знаходзілі адпаведных сродкаў. Але дзіцячаму конкурсу, як запэўніў спадар Стакселіюс, не змогуць перашкодзіць ніякія складанасці, бо мінімальная колькасць яго ўдзельнікаў вызначана даўно. Далучацца да свята і дзве краіны, што не ўдзельнічаюць у конкурсе, але будуць яго трансляваць: гэта Аўстралія і Новая Зеландыя. Што ж да тых краін, якія пакуль адмовіліся ад удзелу з-за эканамічных складанасцей (а тэрмін прыёму заявак ужо мінуў), дык з імі будуць весціся перамовы, каб знайсці магчымыя варыянты вырашэння праблемы.

Тым больш прыемна, што ў беларускіх арганізатараў конкурсу, як заўважыў спрактыкаваны ў гэтых пытаннях госць, няма ніякіх праблем. Стакселіюс застаўся вельмі задаволены падрыхтоўкай: план — выконваецца, усё ўкладаецца ў вызначаныя тэрміны. Што ж да мастацкага боку шоу, дык ён выказаў пажаданне, каб у ім было як мага больш беларускіх нумароў: “Шоу павінна штогод быць розным, і ў кожнага ёсць магчымасць паказаць сваю краіну”. У яго была сустрэча з прадзюсерамі Нацыянальнай дзяржаўнай тэлерадыёкампаніі Беларусі, і ў іх, як падкрэсліў С.Стакселіюс, — шмат цікавых ідэй. Пакуль жа ён асабліва вылучыў цудоўную, на яго думку, ідэю запрасіць у Мінск усіх пераможцаў дзіцячага “Еўрабачання”: такая акцыя адбудзецца на гэтым конкурсе ўпершыню.

Некаторыя “сакрэты” раскрыў і выканаўчы прадзюсер дзіцячага “Еўрабачання-2010”, намеснік старшыні Белтэлерадыёкампаніі Аляксандр Мартыненка. Удзельнікі конкурсу пабываюць на экскурсіях, наведаюць цырк, а таксама Нацыянальны мастацкі музей, пачастуюцца прысмакамі беларускай кухні, паскачуць на дыскатэцы. Колькасць месцаў у глядзельнай зале “Мінск-Арэны” будзе падлічана, калі завершыцца дызайн сцэны. Тады ж білеты трапяць у касы. Сярод жа тых, хто атрымае бясплатныя запрашальнікі, будуць выхаванцы дзіцячых дамоў, дзеці з абмежаванымі фізічнымі магчымасцямі.

Н.Б.

Аляксандр КОЛБЫШАЎ:

“Выйсце для нашага кіно — псіхалагізме”

Сёмы па ліку Рэспубліканскі фестываль нацыянальных фільмаў, які праходзіў у Брэсце, не прынёс сенсацыі: Гран-пры атрымала сёлетняя стужка “Ваўкі”, а лепшым рэжысёрам ігравога кіно быў прызнаны аўтар карціны Аляксандр КОЛБЫШАЎ. Перавага “Ваўкоў” і Колбышава была відавочнай: за апошні час гэта самая яркая мастацкая работа, якая выйшла ў свет на Нацыянальнай студыі. Постаць самога рэжысёра таксама выклікае цікавасць і павагу. Шлях Аляксандра Колбышава ў вялікае кіно быў няпростым: войска, Афганістан, потым — тэатральнае вучылішча, сцэна Брэсцкага драмтэатра і толькі праз колькі гадоў — Беларуская дзяржаўная акадэмія мастацтваў, рэжысёрскі курс класіка айчыннага кіно Віктара Турава... Дарэчы, у верасні, прыкладна ў тыя самыя дні, калі “Ваўкі” выйдуць на экраны беларускіх кінатэатраў, кінематаграфісту споўніцца пяцьдзесят гадоў. Іншыя творцы ў такім узросце падводзяць пэўныя вынікі — Колбышаў рыхтуецца да новых пастановак: у яго назапашана шмат энергіі, якая патрабуе выхаду.

“Энергічны” — менавіта такі эпітэт трэба ўжываць у дачыненні да постаці Аляксандра Колбышава. Няўрымслівая энергія творчага чалавека заўсёды штурхае яго наперад, прымушае спрабаваць новыя метады і нават прафесіі. З шахцёра і кіроўцы дальнемагістральнага грузавіка ён ператварыўся ў вайскоўца, з вайскоўца — у акцёра. Паспяховая сямігадовая кар’ера на тэатральнай сцэне, галоўныя ролі не прымусілі спачываць на лаўрах. На першым Рэспубліканскім фестывалі беларускіх фільмаў у 1997 годзе яго дыпломная кароткаметражная стужка “Прага да жыцця” паводле апавядання Васілія Шукшына абыходзіць поўнаметражныя карціны мэтраў і атрымлівае найвышэйшую ўзнагароду! Паміж двума Гран-пры нацыянальнага фестывалю — гады пошуку, якія не сталі гадамі прастою. Выратавальнай незапатрабаванаму ў кіно для вялікага экрана творцы стала праца над тэлевізійнымі серыяламі. Апошніх у паслужным спісе Аляксандра Колбышава — некалькі, у тым ліку некаторыя часткі серыяла “Опера. Хроники убойного отдела”. З галоўнай ролі ў стужцы калегі Андрэя Кудзіненкі пачалася акцёрская кар’ера ў кіно. Галоўных роляў больш не было, але нават некалькі хвілін прысутнасці акцёра Колбышава ў кадры дастаткова, каб зрабіць любую стужку больш цікавай.

Відавочнае імкненне Колбышава-рэжысёра да “экстрэмальнай”, “мужчынскай” тэматыкі: пэўна, сказваецца вайсковае мінулае. Героі стужак Колбышава, як правіла, — заложнікі цяжкіх сітуацый... Дзякуючы гэтаму ягоныя фільмы атрымліваюць відавочнае экзістэнцыйнае адценне, іх лёгка параўнаць з творамі класікаў беларускай літаратуры, якія пісалі пра вайну. “Ваўкі” зняты па аповесці калегі Колбышава — рэжысёра Аляксандра Чакмянёва, — што была напісана яшчэ ў 1964 годзе, але пабачыла свет толькі ў 2003-м. Шмат рэжысёраў прымерваліся да яе экранізацыі, але сіл хапіла толькі ў Аляксандра Колбышава. Здымкі ішлі ўсяго 42 дні, потым быў працяглы мантажна-таніровачны перыяд, у выніку чаго атрымалася не чаканая рэтра-драма з сярэдзіны — канца 1940-х, а нешта куды больш глыбокае і актуальнае.

Сур’ёзная стужка для сур’ёзнага гледача

— Галоўны герой карціны — сам Час, — кажа рэжысёр. — Перадаць адчуванне складанай пасляваеннай эпохі, эмоцыі яе жыхароў і было нашай галоўнай задачай. Але не трэба думаць, што “Ваўкі” — стужка цалкам гістарычная. На маю думку, галоўнае ў яе сюжэце — супрацьстаянне характараў, сутыкненне моцы фізічнай і моцы духоўнай. Канфлікт паміж персанажамі, абставінамі, жыццём — наогул галоўная ўмова любой мастацкай кінакарціны. Заўважце: у стужцы няма адзінага галоўнага героя, герой у нас — калектыўны.

— Сучаснае кіно, у тым ліку беларускае, імкнецца найперш забаўляць гледача, у чым, зразумела, няма нічога кепскага. Тым не менш, “Ваўкі” — стужка прынцыпова сур’ёзная, выпускаць яе на экраны — пэўная рызыка і для студыі, і для рэжысёра...

— Так, для нас было прынцыповым зрабіць сур’ёзную стужку для сур’ёзнага гледача з пэўным жыццёвым досведам, бо “Ваўкі” — гісторыя, напоўненая псіхалагізмам: яна апавядае пра людзей у так званай пагранічнай сітуацыі — паміж жыццём і смерцю. Галоўным у стужцы з’яўляецца менавіта сюжэт, а не знешнія эфекты, хоць і над імі мы добра папрацавалі: уся “карцінка” спецыяльным чынам апрацавана з дапамогай камп’ютэрнай праграмы і мае спецыфічныя адценні — як на старым фота.

“Ваўкі” для мяне сталі пэўным этапам, добрым спосабам адказаць на складаныя жыццёвыя пытанні, якія паўставалі цягам дзесяцігоддзяў. Цяпер у мяне — зусім іншы настрой і іншыя памкненні. Мяркую, што наступнай стужкай якраз можа стаць нешта больш забаўляльнае, жанравае — меладрама, напрыклад. Што да аўдыторыі фільма, то, згодны, ён мае менш шанцаў сабраць вялікія грошы ў кінатэатрах. “Масакра” ж, відаць, будзе больш цікавая для маладых гледачоў. Але, упэўнены, “Ваўкі” знойдуць вялікую тэлевізійную аўдыторыю: перамовы з самымі рэйтынгавымі тэлеканаламі на гэты конт ужо вядуцца.

— Лічыцца, што сучаснае кіно амаль цалкам пабудавана на відовішчных спецэфектах...

— Безумоўна, так яно і ёсць. Толькі мяне як рэжысёра цікавіць не тэхніка (з яе дапамогай можна зрабіць што заўгодна), а “чыстае” кіно: драматургічныя, мантажныя прыёмы і хады, якія дазваляюць ствараць пэўнае напружанне, шматзначнасць у кадры, калі за звычайнымі рэплікамі герояў глядач адчувае нешта куды больш важкае. Толькі працуючы такім чынам рэжысёр можа праверыць свае творчыя магчымасці, бо “схавацца” за спецэфектамі і вялікім бюджэтам прасцей за ўсё. Для нашага кіно, што не мае вялікіх фінансавых рэсурсаў, такі шлях развіцця — адзіны магчымы спосаб. Сучасны глядач, якога амаль нельга здзівіць, — вельмі патрабавальны, поспех у яго будуць мець толькі самыя шчырыя, пранікнёныя стужкі. Я часта задаю сабе гэтае пытанне: як прывабіць гледача? — і адназначнага адказу на яго не ведаю. Выйсце, лічу, — у псіхалагізме.

Герой нашага кінематографа

— Як, на вашу думку, павінен выглядаць сучасны герой? Наогул, хто ён? Калі ў 90-я экран запаўнялі людзі дзеяння, якія дамагаліся поспеху любымі сродкамі, то сёння казаць пра нейкі пэўны вобраз не даводзіцца...

— Пытанне — вельмі складанае. Па сутнасці, дакладнага адказу на яго ніхто і не ведае. Пошукі сучаснага героя вядуцца актыўна, але пакуль беспаспяхова. Тыя рэжысёры, якія знойдуць патрэбны вобраз, змогуць куды лягчэй абазначыць антыгероя: яго і выконваць лягчэй, і гледачам адмоўны персанаж запамінаецца лепш, бо рысы яго характару можна зрабіць больш выразнымі. Для мяне арыенцір у выбары галоўнага героя — толькі асабісты жыццёвы досвед. Як акцёру даводзіцца часта ўвасабляць менавіта адмоўных персанажаў, як, напрыклад, у тэлевізійнай стужцы Дзмітрыя Лася “Трамвай у Парыж”. Аднак без барацьбы Дабра і Зла ні кіно, ні жыццё не абыходзяцца.

Калі казаць пра 90-я, то тагачасныя кінагероі — зусім не ідэальныя. Згадайма таго ж знакамітага Данілу Багрова ў выкананні Сяргея Бадрова з дылогіі Аляксея Балабанава “Брат”: персанаж — сімпатычны, але... Для мяне такое цалкам непрымальна.

— Каго хацелася б выканаць Колбышаву-акцёру, і ці ёсць верагоднасць вашага вяртання на сцэну?

— З усёй драматургіі мяне найбольш прываблівае творчасць Аляксандра Вампілава: гэта геніяльны аўтар, бо ягоныя героі існуюць у звычайных, “побытавых” абставінах, але перажываюць шэкспіраўскія жарсці. З усіх вампілаўскіх герояў мне больш за іншых імпануе Шаманаў з твора “Мінулым летам у Чулімску...”. Але вяртацца ў тэатр я не планую: гэтая старонка майго жыцця даўно перагорнута. Да таго ж, кінематограф дазваляе мне самавыяўляцца куды яскравей. Зразумела, часцяком даводзіцца ісці на кампрамісы, здымаць абсалютна жанравае, тэлевізійнае кіно. Але і тут ёсць свае плюсы: праца з тэлеканаламі дысцыплінуе, прымушае вывучаць камерцыйны бок кіно, прадзюсерскую справу, лепш планаваць будучыя работы, уяўляць сабе, для якой аўдыторыі яны здымаюцца, на якога гледача разлічаны. На жаль, у беларускім кіно толькі пачынаюць сур’ёзна займацца апошнімі акалічнасцямі. Між тым, ад іх залежыць поспех любой стужкі.

— Крытыкі кажуць, што Аляксандр Вампілаў — унікальны драматург, з шэрагу тых, якія нараджаюцца раз на паўстагоддзя. На жаль, так званая сцэнарная праблема — адна з асноўных не толькі ў нас. У стылі паўнавартаснага аўтарскага кінематографа вы самастойна пішаце сцэнарыі да сваіх стужак. Ці можа гэта быць прыкладам для іншых рэжысёраў?

— Драматургія — гэта тое, што прывяло мяне да мастацтва. Калі служыў у Афганістане, вельмі хацелася чытаць, а ніякіх кніг там не было. У вежы БМД, побач з тэхнічнай дакументацыяй, знайшоў томік драматургіі. З дзяцінства не любіў чытаць “па ролях”, але тут выйсця не было — пачаў чытаць, уцягнуўся. Раптам тэкст абарваўся: апошнія старонкі выдраны. Колькі часу мне карцела даведацца, чым жа скончылася справа, але толькі па вяртанні выпадкова натрапіў на тую самую п’есу і дачытаў да канца. Гэта была “Нора” Генрыка Ібсена — геніяльная, я лічу, рэч. Той выпадак так абудзіў мае творчыя памкненні, што прымусіў не толькі заняцца літаратурнай творчасцю, пісаць сцэнарыі, але і ісці ў тэатр, а потым — у кіно. Дзякаваць Богу, маім майстрам стаў Віктар Цімафеевіч Тураў — чалавек, які заўсёды вельмі паважліва падыходзіў да драматургічнага матэрыялу. Аўтарскае кіно — менавіта самастойная праца рэжысёра над усімі этапамі стварэння карціны. Я заўсёды імкнуся да такой схемы, ахвяруючы акцёрскімі амбіцыямі, — ніводнага разу не зняўся ў сваім кіно. Месца рэжысёра — па гэты бок камеры; у кадры ж павінен быць толькі акцёр.

Добрае кіно — толькі ад шчырага сэрца

— Сучасны кінематограф і яго стваральнікі існуюць у вельмі жорсткіх рынкавых умовах. Часта даводзіцца займацца зусім не тым, чаго хочацца. Але кіно — такая справа, якой нельга прысвячаць усяго восем гадзін у суткі...

— Усё роўна хочацца здымаць нешта абсалютна аўтарскае, сваё, набалелае. Добрае кіно можна здымаць толькі для сябе, для душы. І не трэба баяцца, нібыта яго не зразумеюць, не прымуць. Калі тое, што ты робіш, падабаецца табе, то яно спадабаецца як мінімум тваёй сям’і, блізкаму колу сяброў, знаёмых. Глядач заўсёды знойдзецца! Менавіта з такім настроем належыць прыступаць да здымак. І трэба старацца пазбягаць “кампрамісаў”. Калі я прадставіў праект “Ваўкі” расійскім прадзюсерам, яны прапанавалі зрабіць з яго серыял для тэлебачання, але я катэгарычна адмовіўся, бо гэтая гісторыя можа выглядаць найлепшым чынам толькі на вялікім экране ў сканцэнтраваным выглядзе. Я вельмі ўдзячны “Беларусьфільму”, што атрымаў магчымасць працаваць дома і менавіта так, як хочацца.

Гутарыў Антон СІДАРЭНКА
Фота Сяргея ЖДАНОВІЧА

“Мінская шаша” класікаў

Адзін з самых запамінальных літаратурных герояў мастацкіх твораў пра Вялікую Айчынную вайну — Васіль Цёркін. Помнік гэтаму персанажу і яго аўтару — пісьменніку Аляксандру Твардоўскаму — устаноўлены ў самым цэнтры Смаленска. Славутаму майстру слова і яго беларускаму сябру — народнаму паэту Пятрусю Броўку прысвечана выстаўка ў Літаратурным музеі нашага класіка.

Гэтымі днямі Твардоўскаму споўнілася б 100 гадоў. Як вядома, ён меў надзвычай цесныя стасункі з нашай краінай. Ды і першы пераклад твораў Твардоўскага адбыўся менавіта на беларускую мову — пасля таго, як беларускія пісьменнікі запрасілі ў Мінск сваіх смаленскіх калег. Менавіта ў тым далёкім 1934 годзе ў беларускай сталіцы сустрэліся ды пасябравалі Аляксандр Твардоўскі і Пятрусь Броўка.

Аляксандр Твардоўскі.

Праз дзесяцігоддзе ў якасці ваеннага карэспандэнта “Красноармейской правды” Аляксандр Твардоўскі браў удзел у вызваленні Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. З першым эшалонам савецкіх войскаў 3-га ліпеня 1944 года пісьменнік увайшоў у сталіцу Беларусі, і, нягледзячы на напружаны тэмп наступлення, знайшоў колькі хвілін, каб пабываць на папялішчы дома народнага паэта Янкі Купалы, чыю творчую спадчыну высока цаніў.

У радасныя дні вызвалення Мінска Твардоўскаму давялося праехаць, як ён сам прыкладна падлічыў, на рэдактарскім “вілісе” 532 кіламетры “ўздоўж развернутых дарог і спустошаных сёлаў”. Убачанае літаратарам у той знамянальны дзень знайшло адлюстраванне ў нарысах “Первый день в Минске”, “Сердце народа”, “Домой”, “Лявониха”, “В краю опустевших лесов”. Тады ж у Твардоўскага нарадзіўся і верш “Минское шоссе”.

Мінск. 3 ліпеня 1944 г.

Падобны ваенны лёс напаткаў і Петруся Броўку, які на пачатку Вялікай Айчыннай добраахвотна пайшоў у Чырвоную Армію: у 1941 — 1942 гг. ён быў інструктарам-літаратарам франтавой газеты “За Савецкую Беларусь!” на Бранскім і Заходнім франтах, супрацоўнічаў з партызанскім друкам.

Праз некалькі тыдняў пасля вызвалення Беларусі дарогі двух паэтаў зноў скрыжаваліся ў Мінску. Пасля выпадковай сустрэчы Пятрусь Броўка запрасіў сябра да сябе дамоў, дзе літаратары дзяліліся навінамі з фронту, ваеннымі ўспамінамі і перажываннямі. Як зазначыў літаратурны крытык Цімафей Ліякумовіч у нарысе “Александр Твардовский в освобожденном Минске”, “...паэты пасядзелі па-франтавому. Твардоўскі дастаў сваю пайку з рэчавага мяшка, сёе-тое атрымалася знайсці і Броўку. Пад час абеду Твардоўскага асабліва парадавалі свежыя агуркі: “...Ці разумееш, Пеця, што гэта значыць, — казаў захоплены Твардоўскі, — першыя агурочкі, выгадаваныя на тваёй вызваленай зямлі? Ну ты палюбуйся толькі!..” І ён узбуджана круціў, як нейкі цуд, зялёны агурок перад нашымі тварамі. “А што за смак!” — захапляўся ён, асцярожна адкусваючы. “І нам сапраўды пасля такіх захопленых водгукаў свежыя агуркі з беларускай градкі здаліся асабліва смачнымі”, — прызнаваўся П.Броўка”.

А літаральна праз тры гады, у 1947-м, Броўка разам з Твардоўскім наведваюць Польшчу, канцлагер “Асвенцым”, дзе абарвалася жыццё маці нашага паэта, якая была сувязной у партызанскай брыгадзе. Пра гэтую паездку сведчыць фотаздымак з фондаў Літаратурнага музея Петруся Броўкі, які ўвайшоў у новую выстаўку “Пятрусь Броўка і Аляксандр Твардоўскі”, прысвечаную юбілеям паэтаў-франтавікоў. Разам з ім экспануюцца і больш за 30 ваенных фота Твардоўскага, перададзеных Смаленскім дзяржаўным музеем-запаведнікам, копія “Красноармейской правды” 1942 года, дзе ўпершыню былі надрукаваны раздзелы паэмы “Васіль Цёркін”, а таксама шэраг іншых цікавых і каштоўных матэрыялаў.

Пятрусь Броўка.

К.А.

Хто веславаў у Случы?

Вельмі часта першыя згадкі пра старажытныя гарады былі звязаны з удзельнымі войнамі і нават вынішчэннем саміх паселішчаў. Гэтак сама атрымалася і са Слуцкам. “В лето 6624 (1116)...” вялікі князь кіеўскі Уладзімір Манамах напаў на мінскага князя Глеба, які перад гэтым спаліў Слуцк, і, як зазначае летапіс, “...и не каяшеться о сем, ни покоряшеться”.

Раскопкі на месцы колішняй клеці XII — XIII стст.

Большасць даследчыкаў лічыць гэты год найбольш верагоднай датай першай згадкі Слуцка ў пісьмовых крыніцах. Але сярод гісторыкаў існуюць і іншыя версіі, што сведчаць пра больш ранняя даты, напрыклад, 1097-ы, 1086-ы і нават 1005 год. Апошнюю слуцкі краязнаўца Р.Родчанка, у свой час, прапаноўваў афіцыйна прызнаць датай першага ўпамінання пра Слуцк у пісьмовых крыніцах. Але сумненні выклікае той факт, што яна згадваецца ў адносна позніх пісьмовых крыніцах. Апошняе не дазваляе яе канчаткова прыняць. Тым не менш, археалагічны матэрыял, знойдзены пад час раскопак, можа пацвердзіць версію мясцовага краязнаўцы.

Археалагічныя раскопкі, якія праводзіліся ў Слуцку ў 1985 — 1987 гг. і ў 1999 г., дазваляюць устанавіць, што першымі жыхарамі на пясчанай выспе, размешчанай у сутоках рэк Случ і Бычок, былі старажытныя балты, якія прыстасавалі гэтую выспу пад гарадзішча. Артэфакты таго перыяду — ім больш як паўтары тысячы гадоў — прадстаўлены знаходкамі жалезнай утулкавай сякеры-кельта, гліняных прасліц на верацяно і фрагментамі кухоннага посуду са штрыхамі. Верагодней за ўсё, напрыканцы IX — на пачатку X стст. на ўрадлівыя глебы Случчыны прыйшло ўсходнеславянскае племя дрыгавічоў. На такую думку наводзіць знаходка візантыйскай манеты імператара Васілія I (867 — 886 гг.), выяўленая ў раскопках, што праводзіліся на пасадзе Слуцка. Трапіць сюды гэтая манета магла ў выніку гандлёвых стасункаў з паўднёвымі суседзямі дрыгавічоў — драўлянамі, або нават непасрэдна з візантыйскіх калоній паўночнага ўзбярэжжа Чорнага мора. У XI ст. прадстаўнікі гэтага племені засялілі старажытнае гарадзішча, сведчаннем чаго сталі чарапкі глінянага посуду гэтага часу, знойдзеныя ў раскопках на гарадзішчы. У XII — XIII стст. яно ператвараецца ўжо ў дзяцінец летапіснага Слуцка, дзе пражываў князь або ягоны намеснік. Тым часам першым князем Слуцка, пра якога згадвае летапіс, быў Уладзімір Мсціслававіч — унук кіеўскага князя Уладзіміра Манамаха.

Кожны ўдзельны князь лічыў справай гонару мець на сваім двары ўласны храм. І таму, як сведчаць даныя раскопак, на слуцкім дзяцінцы ўзводзіцца царква. Пра гэта сведчаць знаходкі плінфы і вапняковыя падчасаныя пліты, з якіх гэты храм будавалі. Тэхніка ўзвядзення храмаў, дзе спалучаліся плінфа і вапняковыя пліты, адзначана таксама ў Віцебску і Навагрудку. Верагодна, што ўсе гэтыя тры царквы ўзводзіла адна і тая ж арцель дойлідаў.

Праўда, першаму князю Слуцка нядоўга давялося любавацца творчасцю гэтых майстроў, бо праз пару гадоў слуцкі сталец у яго адабраў кіеўскі князь — ягоны брат Расціслаў Мсціслававіч, які затым далучыў Слуцк да Тураўскага княства.

Як і кожны горад эпохі Сярэднявечча, Слуцк меў свае ўмацаванні. У XII — XIII стст. яго дзяцінец ахопліваў насыпны вал шырынёй у падножжы больш за дваццаць метраў і вышынёй каля чатырох, на версе якога ішоў частакол з бярвення.

Археалагічныя раскопкі, што праводзіліся аўтарам артыкула ў Слуцку, дазваляюць, разам з данымі пісьмовых крыніц, у пэўнай ступені рэканструяваць аблічча сярэднявечнага Слуцка.

У прыватнасці, паводле даных раскопак, шырыня вулічных маставых па дзяцінцы летапіснага Слуцка складала амаль два метры. Вуліцы масціліся з дошак, бярвення і аполкаў на лагі. Цікава, што як і сёння, вуліцы, па даных тых жа раскопак, рэгулярна рамантаваліся.

Кісцень, бронзавае наверша булавы, каменная форма для вырабу ўпрыгожанняў, рулявое вясло, бурштынавая падвеска (усё — XII — XIII стст.).

Уздоўж вулічных маставых месціліся гарадскія сядзібы, якія размяжоўваліся частаколам. Звычайна кожная з іх уключала адно-два жытлы і пару-другую гаспадарчых пабудоў. Жытлы Слуцка гэтага часу ўяўляюць з сябе зрубы плошчай да 20 кв. м. У куце зруба размяшчалася глінабітная печ. А вось пабудовы гаспадарчага прызначэння — клеці і хлявы — былі невялікія: усяго 4 — 12 кв. м.

Раскопкамі выяўлена і пабудова вытворчага прызначэння — кузня XII ст. Чаго тут толькі ні знойдзена: гэта і зубілы, і прабойнікі, і малаток-цвікадзёр, і нават цвікарні! А саміх цвікоў, замкоў і ключоў, сабраных у гэтай кузні, хапіла б на цэлую скабяную краму! Увогуле ж, знаходак пад час раскопак Слуцка знойдзена так шмат, што іхні лік ідзе ўжо не на адну тысячу. Сярод іншага, прадстаўлены і прадметы ўзбраення: наканечнікі дзід і стрэлаў, дэталі мяча і шаблі, кісцень і булава. Дарэчы, апошняя выраблена з бронзы і з'яўляецца не столькі зброяй, колькі атрыбутам улады.

Знойдзены ўпрыгожанні з каляровых металаў (срэбра і бронза) — падвескі, бранзалеты, а таксама шкляныя пацеркі, пярсцёнкі, бранзалеты... Апошніх колькасцю больш за паўтысячы. Сярод іх — сінія, блакітныя, зялёныя, жоўтыя, карычневыя, замежнай і айчыннай вытворчасці, словам — на любы густ слуцкіх модніц таго часу. А гандлявалі тамтэйшыя жыхары на той час нават з далёкім замежжам. Напрыклад, з Прыбалтыкі сюды трапіла бурштынавая падвеска ў выглядзе стылізаванага крыжа, на якім, для большай святасці, быў прадрапаны дадаткова раўнаканечны, грэчаскі крыж. З візантыйскіх калоній тут знойдзены шкарлупіна валоскіх арэхаў і фрагменты амфар. У апошніх прывозілі віно на патрэбы царкоўныя і на ўцехі княскія. Прывозіліся адтуль і нацельныя, выраблены з чырвонага каменю — парфіру — крыжыкі, якія называлі “карсунчыкі” паводле назвы Корсуні — Херсанэса, як яго тады называлі ў старажытнарускіх пісьмовых крыніцах.

Дзякуючы знаходкам, можна рэканструяваць нават карціны тагачаснага жыцця, пэўныя побытавыя сітуацыі. Да прыкладу, рулявое вясло: відавочна, нехта прыплыў па Случы, паклаў яго за клеццю, ды так яно і засталося там ляжаць, пакуль праз 800 гадоў, яго не знайшлі археолагі. Або той жа званок, луджаны меддзю, што клапатліва вешаўся чыёйсьці “рыкулі” на шыю, каб тая не заблукала ў час выпасу. Як і цяпер, нашы продкі ў XII — XIII стст. з задавальненнем наведваліся ў лес, пра што сведчыць ці не з паўвядра лясных арэхаў. А вось на глыбіні каля чатырох метраў у вільготным слоі археолагамі быў адшуканы “пеўнік стракаты” — грыб, які захаваўся так, што хоць цяпер у засол кладзі.

Леанід КАЛЯДЗІНСКІ,
дацэнт БДПУ імя М.Танка, археолаг

Перамога над сонцам Льва Юдзіна

Ад супрэматызму — да "рэальных фактаў часу"

Дык пра якую ж версію я распачаў гаворку мінулым разам?
Па-першае, з пачатку 30-х Юдзін цалкам перайшоў на станковую графіку, кніжнае афармленне і "рэалістычны" жывапіс (у Трацякоўцы ёсць яго "Блакітны нацюрморт" гэтага перыяду); па-другое, лічу, не апошнюю ролю тут адыграла яго стрыечная сястра Марыя Веніямінаўна Юдзіна, блізкая сяброўка Кацярыны Пешкавай і іншых уплывовых асоб. Гэтыя сувязі дапамаглі ёй выратаваць ад ГУЛАГа і рэпрэсій не адну чалавечую душу. Ну і, па-трэцяе, Юдзін, паводле складу характару, мабыць, быў "не арол" і пазбягаў усялякай палітыкі. Хаця я павінен тут зрабіць наступную рэмарку.

Леў Юдзін.

У ніжнім радзе: Г.Ляпорская, І.Чашнік, Л.Юдзін. 1924 г.

(Заканчэнне. Пачатак у № 26.)

Практычна ўсе 1930-я гады Юдзін прапрацаваў у дзіцячым аддзяленні Дзяржаўнага выдавецтва, што друкавала цудоўныя тагачасныя часопісы "Чиж" і "Ёж". У гэтай "Акадэміі Маршака" працавалі найбольш таленавітыя паэты і мастакі краіны, якія расказвалі ва ўмовах сталінскага рэжыму прыгожыя байкі пра тое, "как хорошо в стране советской жить", і што жыццё з кожным днём становіцца лепшым і весялейшым. Гэта быў, так бы мовіць, "парадны" бок жыцця "Акадэміі". А "непарадны" заключаўся ў тым, што многія члены рэдкалегіі гэтых дзіцячых часопісаў былі арыштаваны, рэпрэсіраваны, расстраляны або замардаваны ў лагерах. Сярод іх — В.Ермалаева, П.Сакалоў, Д.Хармс, М.Алейнікаў, А.Увядзенскі, Б.Малахоўскі і многія іншыя. Урэшце, цкаванне лепшых дзіцячых паэтаў і мастакоў СССР пачалося яшчэ ў 1929 годзе. Тады ж пачалі рэзка выкрываць творчасць С.Маршака і асабліва — К.Чукоўскага. І тут жа, як заўсёды, усе цэнтральныя газеты і часопісы адгукнуліся пад лозунгам "Дадим нашим детям новую литературу!" уласцівымі таму часу артыкуламі ды карыкатурамі з заклікамі расправіцца з выдумшчыкамі такіх казак і фантазій, што адцягвалі ўвагу дзяцей ад рэальнага жыцця і класавай барацьбы.

І як адчувалі сябе Юдзін — аўтар малюнкаў да кніг рэпрэсіраванага А.Увядзенскага "Хто я?" — або яго сябра Э.Крымер — ілюстратар кнігі пазней загінуўшага ў лагеры Д.Хармса "Як бабулька чарніла купляла"? Не ведаю, ці паўплывалі гэтыя рэпрэсіі на далейшую творчасць Юдзіна, але ў перадваенныя гады ён быў вельмі асцярожны ў сваіх мастакоўскіх прыхільнасцях, пераходзячы на больш "лёгкія" і "бяспечныя" віды і жанры мастацтва.

У асноўным, гэта — друкаваная графіка, кніжная ілюстрацыя і "папяровая скульптура". Серыя апошніх, па перакананні мастацтвазнаўцаў, прадугадала сённяшнюю канцэптуальную пастановачную фатаграфію. Справа ў тым, што свае напаўабстрактныя папяровыя скульптуры Юдзін фатаграфаваў строга пры пэўным асвятленні. Аднак не ўласна скульптуры, а менавіта гэтыя фотаздымкі рабіліся канчатковымі творамі мастацтва. Такі прыём праз паўстагоддзя зазначыў маскоўскі мастак-авангардыст Францыска Інфантэ (я яго трошкі ведаў), які ішоў у сваёй творчасці ў рэчышчы так званых еўраканцэптуалаў. Але ў даваенным Ленінградзе Юдзін быў першым і адзіным наватарам у гэтай галіне.

Яшчэ ён вызначаўся ў графіцы асаблівым талентам сілуэтнага адлюстравання. Гэтаму мастацтву ён навучыўся ў сваёй матулі яшчэ ў Віцебску. Без папярэдняй падрыхтоўкі ён віртуозна выразаў нажніцамі маленькія сілуэты жывёл, птушак і людзей, часта — у складаных кампазіцыйных спалучэннях. Творы вылучаліся дзівоснай тонкасцю і зграбнасцю малюнка, дэкаратыўна-рытмічным майстэрствам і прывабнасцю "вобразаў".

Але галоўнай галіной яго творчай дзейнасці стала кніжна-часопісная графіка. Менавіта на гэтай глебе Юдзін здружыўся з такімі цудоўнымі мастакамі і літаратуразнаўцамі, як У.Лебедзеў, У.Курдаў, П.Сакалоў, Д.Хармс, Ю.Васняцоў, М.Забалоцкі, М.Алейнікаў.

У 1938 — 1939 гг. Юдзін прыдумаў дзве кнігі, прысвечаныя святочным сустрэчам яго самых блізкіх сяброў: мастакоў Паўла Кандрацьева, Эдуарда Крымера, Тэадора Пеўзнера, Саламона Левіна. Справа ў тым, што гэтая неразлучная чацвёрка ў суправаджэнні жонак, дзяцей і сваякоў здзяйсняла доўгія падарожжы па Наўгародскай, Ленінградскай абласцях і Украіне. Актыўны адпачынак ва ўсіх іх спалучаўся з напружанай і творчай працай: ні дня без малюнка… Успаміны Юдзіна якраз і адлюстраваны ў гэтых кнігах.

Першая — "Охтиньки" — была падрыхтавана да сустрэчы 8 лістапада 1938 года пасля вяртання групы з вёскі Мірабудзіцы, што на Наўгародчыне. Назва ўзята з характэрных воклічаў тамтэйшых сялянак пасля мясцовых навін:"Охтиньки! Что делается!". Тут жа Юдзін прыдумвае сяброўскія эпіграмы на ўсіх членаў групы: № 1 і № 2 адрасаваны Левіну; № 3 — Пеўзнеру; № 4 — жонцы, Марыі Гарохавай; № 6 — Кандрацьеву; № 7 — Крымеру; № 8 — сястры, А.Юдзінай.

Другая кніга — "Бягучыя справы" — была падрыхтавана да сустрэчы 2 мая 1939 года. Гэта падрабязныя апісанні побыту, алоўкавыя і акварэльныя накіды, карыкатуры, шаржы і беглыя подпісы да іх. Ёсць і водгаласы гарачых дыскусій ды спрэчак паміж паслядоўнікамі Малевіча, што засталіся яшчэ на волі, і іх раз'юшанага антыпода — мастака Дзмітрыя Мітрохіна, які, дарэчы, у перадваенныя гады аказаў моцны ўплыў на Юдзіна як выдатны майстар разцовай гравюры.

Юдзін, Кандрацьеў і Крымер шмат кантактавалі з Мітрохіным і захавалі да канца захопленыя адносіны як да чалавека і маэстра разца, нягледзячы на яго "антымалевічаўскія" пазіцыі.



Л.Юдзін. "Аранжавы малочнік і бутэлька".

У нешматлікіх лістах з фронту Юдзін часта ўзгадваў сваіх сяброў і настаўнікаў. Так, у кастрычніку 1941 года піша: "Малевіч і Мітрохін абудзілі такія пачуцці, якія могуць загінуць ужо толькі са мной разам". А будучы народны мастак Расіі, акадэмік, калісьці вядомы авангардыст, Канстанцін Ражджэсвенскі, сябар Юдзіна, ганіў яго за захапленне "непапраўным "рэалістам" Мітрохіным: "Мне становіцца сумна за цябе. Ты сам сябе падманваеш і падманваешся, звужаючы свой творчы дыяпазон. Інакш я не магу растлумачыць тваё захапленне Мітрохіным". Ну што тут можна сказаць? Мабыць, Ражджэсвенскі не зусім меў рацыю: Юдзін аднолькава паважаў як мастакоў і Пікаса, і Сезана, і Рэпіна, і Дэйнеку, і Малевіча. Чаму ж не? Да новага — 1941 — года Юдзін намаляваў серыю віншавальных паштовак, якія чамусьці не былі ўручаны адрасатам-сябрам ("Полю" — П.Кандрацьеву; "Дарагому Эдзіку" — Э.Крымеру; "Брату Тэа" — Т.Пейзнеру), у якіх выкарыстоўваў вясёлыя аплікацыі з цукерачных фанцікаў з дамаляванымі смешнымі дэталямі. Гэта былі апошнія работы, якія аб'ядналі сяброў… З першых дзён вайны ўсе яны пайшлі на фронт… Кандрацьеў і Крымер дайшлі да Перамогі. Пеўзнер у 1942-м загінуў у Ленінградзе…

А вось малодшаму лейтэнанту Льву Юдзіну доўга паваяваць не давялося: камандуючы ўзводам, ён загінуў у першым жа баі пад вёскай Усць-Тосна 9 ці 10 лістапада 1941 года…

Гэта быў пачатак стратэгічнай контрнаступальнай аперацыі 54-й арміі Ленінградскага фронту супраць буйной Ціхвінскай групоўкі фашыстаў, якая, на жаль, скончылася няўдала. Напярэдадні бою, па злой іроніі лёсу, Юдзін атрымаў "бронь" ад Саюза мастакоў, але адмовіўся выкарыстаць нечаканы "падарунак". Мастак палічыў гэта здрадніцтвам у адносінах да байцоў свайго ўзвода.

Апошнія лісты з фронту былі адпраўлены ім 5 і 6 лістапада 1941-га. Прывяду некалькі фрагментаў з іх. Упершыню яны былі надрукаваны ленінградскім журналістам Віктарам Царыцыным у № 3 часопіса "Нева" за 2006 год.



"УНОВИС"

СОДЕРЖАНИЕ:
1. Партийность в искусстве. М. Кунин.
2. Уновис в мастерских. Л. Хидекель.
3. Архитектурный факультет. И. Чашник.
4. О натюр-морте. Л. Юдин.

Товарищи! готовьтесь к всероссийской весенней выставке „Уновис" в Москве.

II-ое издан. Вит. творкома „Уновис"

Витебск 1921 г. январь.

"***Ленінград 5 лістапада 1941 г. Д.І. Мітрохіну.***

Сёння ад'язджаю ў дзеючую армію. У маёй запісной кніжцы — застаўкі і ініцыялы з Вашай кнігі пра Суворава. Радуюся, што маю рэчы, зробленыя Вашай рукой. Углядаюся ў іх з любоўю і ўваходжу ў ваш свет мастака, які мне такі блізкі і дарагі…";

"***5 лістапада 1941 г. М.Гарохавай.***

*Дарагая мая жонка, мая радасць! Ведаеш, хто ўчора адправіў мае лісты табе? Паша Кандрацьеў! Ён быў учора ў мяне на выпуску (Малодшых камандзіраў. — **Б.К.**). Як было прыемна яго пабачыць! Любы мой Паўлік! Шкада было з ім расставацца…";*

"***6 лістапада 1941 г. Ленінград. М.А. Гарохавай.***

20.00. Мая дарагая жонка! Віншую цябе і сынулю з надыходзячым святам! Не так важна, што гэтая паштоўка прыйдзе пазней. У гэты ўрачысты дзень я з вамі, мае любімыя! Рухаючыся па дарозе ў сваю часць, я ведаю, што і вы думаеце пра мяне зараз. Праязджаў міма твайго дома. Якім новым паказаўся мне мой горад, якім цудоўным! Ляжым на нарах, балбочам. Цёпла, светла, мы цалкам пад'еўшыя. Таварышы расказваюць пра баі, у якіх удзельнічалі…"

Пасля вайны імя Юдзіна як бы выпала з гісторыі сучаснага выяўленчага мастацтва. А калі і згадвалася, у тым ліку і ў нашым друку, дык толькі — як вучня Малевіча, члена віцебскага УНОВИСа і супрацоўніка ГИНХУКа.

Наколькі я ведаю, толькі ў 2003 годзе адбылася яго больш-менш поўная персанальная выстаўка ў Музеі сучаснага мастацтва "Царскосельская коллекция" ў горадзе Пушкіне Ленінградскай вобласці. Праз шэсць гадоў, у 2009-м, у Музеі пецярбургскага авангарда (Дом Мацюшына) па вуліцы Прафесара Папова адкрылася наступная выстаўка Юдзіна, дзе былі прадстаўлены копіі 10 жывапісных карцін мастака, створаныя жонкай Юдзіна — Марыяй Юдзінай-Гарохавай, а таксама макеты кніг, кніжкі-цацкі, ілюстрацыі і дзіцячыя паштоўкі. Аднак, пры ўсёй візуальнай блізкасці да арыгіналаў, жывапісныя творы (копіі), па сведчанні мастацтвазнаўцаў, не з'яўляліся іх механічным паўтарэннем і неслі адбіткі індывідуальнасці гэтай самабытнай мастачкі.

Найбольш значныя творы Юдзіна — нацюрморты "Аранжавы малочнік і бутэлька", "Кафейнік, збан і цукарніца", "Нацюрморт з чывоным самаварам", "Блакітны нацюрморт", супрэматычныя кампазіцыі пачатку 1920-х гадоў — знаходзяцца ў розных расійскіх музеях, у тым ліку ў Рускім музеі і Трацякоўскай галерэі. Партрэт Л.Юдзіна напрыканцы 1930-х напісаў вядомы паэт Сяргей Гарадзецкі, які таксама займаўся і жывапісам, — той самы Гарадзецкі, што адным з першых разгледзеў талент юнага Ясеніна. Гэты партрэт калісьці я бачыў у Рускім музеі, але тады, у 1960-я гады, я не ведаў, што Юдзін меў прамое дачыненне да Беларусі, што ён — родам з Віцебска.

Барыс КРЭПАК

АК Афіша "К"

з 3 ліпеня — да 10 ліпеня

МУЗЕІ *

НАЦЫЯНАЛЬНЫ МАСТАЦКІ МУЗЕЙ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

г. Мінск, вул. Леніна, 20. Тэл.: 227 45 62.

■ Мастацтва Беларусі XII — XIX стст.
■ Мастацтва Беларусі канца XIX — пач. XXI стст.
■ Мастацтва Расіі XVIII — пачатку XX стст.
■ Мастацтва краін Усходу XV — XX стст.
■ Мастацтва краін Заходняй і Цэнтральнай Еўропы XVI — XX стст.
■ Экспазіцыя жывапісу, скульптуры, графікі мастакоў 1940-х — 1980-х гг.

Выстаўкі:

■ **Да 5 — "Жывапіс разнастайнасці"** (жывапіс Мацвея Басава).
■ **Да 5 — "Прамавугольнікі Несцерава, або Экалогія душы"** (жывапіс Рыгора Несцерава).
■ **"Вялікай Перамозе 65 гадоў"** (каля 100 твораў жывапісу, графікі, скульптуры беларускіх і рускіх майстроў).
■ **"Святыя заступнікі ў праваслаўным іканапісе XVI — XIX стст."** (з фондаў Яраслаўскага мастацкага музея).

Філіялы Нацыянальнага мастацкага музея РБ:

МУЗЕЙ "ДОМ ВАНЬКОВІЧАЎ. КУЛЬТУРА І МАСТАЦТВА ПЕРШАЙ ПАЛОВЫ XIX ст."

г. Мінск, вул. Інтэрнацыянальная, 33а. Тэл.: 227 87 96.

■ Пастаянная экспазіцыя.
■ **"Свет з вышыні"** (выстаўка маляваных карт Рубэна Атаяна).

ЗАМКАВЫ КОМПЛЕКС "МІР"

г.п. Мір, Карэліцкі р-н, Гродзенская вобл. Тэл.: (8–01596) 2 30 35.

■ Пастаянная экспазіцыя.

МУЗЕЙ БЕЛАРУСКАГА НАРОДНАГА МАСТАЦТВА ў в. Раўбічы

Спарткомплекс "Раўбічы", Мінскі р-н. Тэл.: 507 44 68.

■ Пастаянная экспазіцыя.

МУЗЕЙ В.К. БЯЛЫНІЦКАГА-БІРУЛІ ў г. МАГІЛЁВЕ

г. Магілёў, вул. Ленінская, 37. Тэл.: (8–0222) 22 48 87.

■ Пастаянная экспазіцыя. Культура І-й пал. XIX в.
■ **"Чорна-белыя мары"** (выстаўка графікі Вячаслава Паўлаўца).

МУЗЕІ *

НАЦЫЯНАЛЬНЫ ГІСТАРЫЧНЫ МУЗЕЙ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

г. Мінск, вул. К.Маркса, 12. Тэл.: 227 43 22.

Экспазіцыі:

■ **"Мастацтва ў гарадской культуры XIX — пачатку XX стст.".**
■ **"Старажытная Беларусь".**
■ **"Беларусь XVI — XVIII стст. у партрэтах і геральдыцы".**
■ **"З крыніц адвечнай прыгажосці".**
■ **"Водбліскі ваеннай славы" (еўрапейская зброя і вайсковае абмундзіраванне XIX — 1-й пал. XX стст.).**

ДЗЯРЖАЎНЫ ЛІТАРАТУРНА-МЕМАРЫЯЛЬНЫ МУЗЕЙ ЯКУБА КОЛАСА

г. Мінск, вул. Акадэмічная, 5. Тэл.: 294 91 96.

■ Пастаянная літаратурна-мемарыяльная экспазіцыя **"Якуб Колас. Жыццё і творчасць".**
■ Тэатралізаваная экскурсія паводле казак Якуба Коласа.

Выстаўкі:

■ **"Футбол — не толькі гульня"** (выстаўка, прымеркаваная да Чэмпіянату свету па футболе, з калекцыі рупліўца культуры Наднёманскага краю Анатоля Грэкава).

ДЗЯРЖАЎНЫ МУЗЕЙ ГІСТОРЫІ БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ

г. Мінск, вул. М.Багдановіча, 15. Тэл.: 334 72 61.

Выстаўкі:

■ **"Лебядзіны скіт"** (ілюстрацыі М.Купавы да аднайменнай кнігі У.Караткевіча).
■ **"Святло стагоддзяў"** (выстаўка, прымеркаваная да юбілейных дат беларускіх асветнікаў).
■ **"Васіль Быкаў. Шлях, вызначаны лёсам".**
■ **"Спадарожнікі дзяцінства".**
■ **"Дарогамі жыцця".**
■ **"Беларускія пісьменнікі XX стагоддзя ў творах выяўленчага мастацтва".**

паштоўках канца XIX — пачатку XX стст.".
■ **"Мінск: падарожжа ў часе".**

ГОМЕЛЬСКІ ПАЛАЦАВА-ПАРКАВЫ АНСАМБЛЬ

г. Гомель, пл. Леніна, 4. Тэл.: (8-0232) 74 19 11.

Цэнтральная частка палаца

Выстаўкі:

■ **"Таямніца высокай моды".**
■ **"Гіганты ледавіковага перыяду"**

Экспазіцыі:

■ **"Культавыя прадметы".**
■ **"Загадкавыя фантазіі мора"** (грот палаца).
■ Экспазіцыя, прысвечаная дзяржаўнаму дзеячу СССР А.Грамыку.
■ **"Чырвоная гасцёўня".**
■ **"Зала ўрачыстых прыёмаў".**

Зімовы сад

Свет субтрапічных раслін і жывёл.

ГОМЕЛЬСКІ АБЛАСНЫ МУЗЕЙ ВАЕННАЙ СЛАВЫ

г. Гомель, вул. Пушкіна, 5. Тэл.: (8-0232) 77 60 60.

■ Ваенна-гістарычная экспазіцыя, прысвечаная гісторыі Гомельшчыны.
■ Лакальныя экспазіцыі ў санітарным вагоне; у партызанскай зямлянцы.
■ На тэрыторыі музея працуе пнеўматычны цір.

Выстаўкі:

■ **"Айчынная вайна 1812 года"** (з фонду Кобрынскага ваенна-гістарычнага музея імя А.В. Суворава).
■ **"Музей крыміналістыкі".**
■ Ваенная тэхніка на адкрытай пляцоўцы.

ГАЛЕРЭІ*

ПАЛАЦ МАСТАЦТВА

г. Мінск, вул. Казлова, 3. Тэл./факс.: 290 60 10.

■ Персанальная выстаўка Міхаіла Ляўковіча.
■ **"Мастацкая прастора Віцебшчыны".**

МАСТАЦКАЯ ГАЛЕРЭЯ "УНІВЕРСІТЭТ КУЛЬТУРЫ"

г. Мінск, Кастрычніцкая плошча, 1 (Палац Рэспублікі). Тэл.: 227 26 12.

■ Дыпломныя работы выпускнікоў Універсітэта культуры.

ГАЛЕРЭЯ ТЫЗЕНГАУЗА

г. Гродна, пл. Тызенгауза, 4. Тэл./факс: (8–0152) 72 27 57.

■ Выстаўка работ беларускіх мастакоў.
■ Выстаўка жывапісу Сяргея Уткіна **"Шчасце ёсць".**

КАРЦІННАЯ ГАЛЕРЭЯ Г.ВАШЧАНКІ

г. Гомель, вул. Карповіча, 4. Тэл.: (8–0232) 77 75 20.

■ Выстаўка-продаж твораў выяўленчага мастацтва, сувеніраў і тавараў для мастакоў.

Выстаўкі:

■ **"Народжаныя морам"** (з серыі "Рамзес": каралы, ракавіны, марскія зоркі, жыхары мора).
■ Выстаўка работ асуджаных крымінальна-выканаўчай сістэмай Гомельскай вобласці (у рамках культурна-асветніцкай праграмы "Шлях у свет мастацтва").

УВАГА!

Паважаныя чытачы!

ІДЗЕ ПАДПІСКА

на газету "Культура"
Падпісныя індэксы: індывідуальная падпіска — 63875, ведамасная падпіска — 638752;

на часопіс "Мастацтва"
Падпісныя індэксы: індывідуальная падпіска — 74958, ведамасная падпіска — 749582.



НА ЖНІВЕНЬ І НАСТУПНЫЯ МЕСЯЦЫ 2010 ГОДА!

Выстаўкі:

■ **"Помніць зямля беларуская"** (выстаўка мастацкіх твораў, прымеркаваная да 65-годдзя Вялікай Перамогі, арганізаваная аб'яднаннем "Традыцыя" грамадскага аб'яднання "Беларускі саюз мастакоў").
■ **"Пачатак. Музей сучаснай беларускай моды"** (сумесны праект беларускіх дызайнераў і супрацоўнікаў музея).

Дом-музей І З'езда РСДРП г. Мінск, пр-т Незалежнасці, 31а. Тэл.: 290 68 47.

■ Пастаянная экспазіцыя **"Гісторыя І З'езда РСДРП".**
■ **"Лятаючыя кветкі"** (выстаўка рэдкіх матылькоў і экзатычных насякомых).

ДЗЯРЖАЎНЫ ЛІТАРАТУРНЫ МУЗЕЙ ЯНКІ КУПАЛЫ

г. Мінск, вул. Янкі Купалы, 4. Тэл.: 227 78 66.

■ Пастаянная экспазіцыя **"Жыццё і творчасць Янкі Купалы".**
■ Цыкл музейна-педагагічных заняткаў **"Дзядзька Янка, добры дзень!".**

Выстаўкі:

■ **"Курганы шмат чаго нам гавораць"** (да 100-годдзя з моманту напісання паэмы "Курган").
■ Выстаўка жывапісу П.Сергіевіча (ілюстрацыі да твораў Янкі Купалы, партрэты Я.Купалы і яго жонкі).

МУЗЕЙ ГІСТОРЫІ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ

г. Мінск, пр-т Незалежнасці, 25а. Тэл: 226 03 98.

Экспазіцыі:

■ Пастаянная экспазіцыя.

Выстаўкі:

■ **"Халодная зброя. Традыцыі і сучаснасць".**
■ **"Как молоды мы были... Семейный альбом".**

Выстаўкі праекта "У пошуках страчанага" У.Ліхадзедава:

■ **"Беларусь. Рэха вайны ў памяці пакаленняў".**
■ **"Беларусь на старых**

■ Экспазіцыя адкрытага захавання археалагічнай калекцыі музея.

Вежа палаца Румянцавых і Паскевічаў

Гісторыка-мемарыяльная экспазіцыя "Уладальнікі Гомельскага маёнтка Румянцавы і Паскевічы".

Выстаўкі:

■ **"З новых кніжных паступленняў".**
■ **"Святыя мясціны зямлі рускай".**

Паўночнае крыло палаца

Выстаўкі:

■ **"...Дзе лялькі так падобны да людзей".**
■ **"Свет звяроў Гомельшчыны".**
■ Працуе куток жывых экзатычных рэптылій.

ТЭАТРЫ*

НАЦЫЯНАЛЬНЫ АКАДЭМІЧНЫ ВЯЛІКІ ТЭАТР ОПЕРЫ І БАЛЕТА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

г. Мінск, пл. Парыжскай камуны, 1. Тэл./факс: 334 11 56.

■ **4 — "Кармэн"** Ж.Бізэ.
■ **5 — Грузінскі балет: "Сагалабэлі", "Серэнада", "Шэсць танцаў".**
■ **6 — "Гала-канцэрт у Вялікім".**
■ **7 — "Папялушка"** С.Пракоф'ева.

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ АКАДЭМІЧНЫ МУЗЫЧНЫ ТЭАТР

г. Мінск, вул. Мяснікова, 44. Тэл.: 200 81 26.

■ **4 — "Мефіста"** (балет у 2-х дзеях) У.Кандрусевіча.

РЭСПУБЛІКАНСКІ ТЭАТР БЕЛАРУСКАЙ ДРАМАТУРГІІ



г. Мінск, вул. Крапоткіна, 44. Тэл./факс: 334 60 08.

■ **5 — "Містэр Розыгрыш"** С.Кандрашова.
■ **6 — "Раман + Юлія"** Д.Балыка.
■ **7 — "Чайка"** паводле А.Чэхава.
■ **8 — "Белы анёл з чорнымі крыламі"** Д.Балыка.
■ **9 — "Адэль"** Я.Таганава.

ШТОТЫДНЁВАЯ ГРАМАДСКА — АСВЕТНІЦКАЯ ГАЗЕТА

Выдаецца з кастрычніка 1991 года
Заснавальнік — **Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь**
Рэгістрацыйнае пасведчанне № 637
Галоўны рэдактар — Людміла КРУШЫНСКАЯ

Рэдакцыйная калегія:
Лілія АНАНІЧ, Уладзімір АРЛОЎ, Уладзімір ГІЛЕП, Ірына ДРЫГА, Аляксей ДУДАРАЎ, Уладзімір ЗАМЯТАЛІН, Валянцін ЕЛІЗАР'ЕЎ, Міхаіл КАЗІНЕЦ, Віктар КУРАШ, Аляксандр РАШЧУПКІН, Барыс СВЯТЛОЎ, Рычард СМОЛЬСКІ, Святлана СУХАВЕЙ, Міхаіл ФІНБЕРГ, Леанід ШЧАМЯЛЁЎ, Уладзімір ШЧАСНЫ.

Рэдакцыя:
Сяргей ТРАФІЛАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), Пётр ОВАД (адказны сакратар).

Рэдактары аддзелаў:
Канстанцін АНТАНОВІЧ, Надзея БУНЦЭВІЧ, Таццяна КОМАНАВА, Барыс КРЭПАК, Яўген РАГІН, Ілля СВІРЫН, Антон СІДАРЭНКА.

Спецкарэспандэнты:
Дар'я АМЯЛЬКОВІЧ, Алена САБАЛЕЎСКАЯ, Юрый ЧАРНЯКЕВІЧ.

Загадчык аддзела фотаілюстрацый — Юрый ІВАНОЎ
Карэктар — Інга ЗЕЛЬГІС
Мастацкі рэдактар — Наталля ОВАД

Адрас рэдакцыі: 220013, Мінск, пр.Незалежнасці,77.
Тэлефон: (017) 289-34-66 (прыёмная) (017) 286-07-97, (017) 334-57-23
Тэлефон/факс: (017) 334-57-35
Рэкламны аддзел: тэл. (017) 334-57-41
www.kimpress.by
E-MAIL: kultura@tut.by

Выдавец — **Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова "Культура і мастацтва"**
Ліцэнзія на выдавецкую дзейнасць ЛВ №02330/0494414 ад 17 красавіка 2009 г.
220013, Мінск, пр.Незалежнасці, 77. Тэл. (017) 289-34-66.
Бухгалтэрыя: тэл. (017) 334-57-35
Аўтарскія рукапісы не рэцэнзуюцца і не вяртаюцца.
Аўтары допісаў у рэдакцыю паведамляюць сваё прозвішча, поўнасцю імя і імя па бацьку, пашпартныя звесткі (нумар пашпарта, дату выдачы, кім выдадзены пашпарт, асабісты нумар), асноўнае месца работы, зваротны адрас.
Меркаванні аўтара могуць не адпавядаць пункту гледжання рэдакцыі.
Аўтары нясуць адказнасць за дакладнасць матэрыялаў.
***Матэрыял на правах рэкламы.**

© "Культура", 2010.

Індэкс 63875
Наклад 8861
Падпісана ў свет 1.07.2010 у 18.30
Замова 3151
РУП "Выдавецтва "Беларускі Дом друку".
ЛП № 02330/0494179 ад 03.04.2009.
Пр.Незалежнасці, 79, 220013, Мінск.

ISSN 1994-4780